Нацыянальны інстытут адукацыі

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ

Л. К. Цітова

# «БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЮ…»

5 КЛАС

Дапаможнік для настаўнікаў

ISBN 978-985-6941-65-1

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**Л. К. ЦІТОВА**

# «БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЮ…»

**5 клас**

***Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2010

УДК 373.5.016:821.161.3.09
ББК 74.268.3(4Беи)
Ц74

Серыя заснавана ў 2010 г.

**Цітова, Л. К.**

Ц74 «Браму скарбаў сваіх адчыняю…»: 5 клас : дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Л. К. Цітова. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 64 с. — (Беларуская літаратура. Факультатыўныя заняткі).

ISBN 978-985-6941-65-1.

**УДК5.016:821.161.3.09**
**ББК 74.268.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-6941-65-1**

© Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2010

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА
# ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма факультатыўнага курса «Браму скарбаў сваіх адчыняю...» скіравана на ўзнаўленне, паглыбленне і сістэматызацыю ведаў, уменняў і навыкаў, атрыманых пяцікласнікамі ў працэсе спасціжэння асноўнага курса беларускай літаратуры, а таксама на развіццё пазнавальнай актыўнасці і творчых здольнасцей вучняў. Прапанаваная праграма цалкам суадносіцца з праграмай па беларускай літаратуры для V класа. Курс роднай літаратуры ў V класе займае асобае месца ў сістэме школьнага навучання — ён з'яўляецца пераходным ад пачатковай школы (літаратурнага чытання) да сістэматычнай літаратурнай адукацыі (літаратурнага навучання). У пяцікласнікаў фарміруецца ўяўленне пра літаратуру як чалавеказнаўства і як мастацтва слова, якому ўласцівы адметныя спосабы вобразнага адлюстравання жыцця; вучні пазнаюць жыццё і чалавека праз мастацкае, эстэтычнае адлюстраванне рэчаіснасці і праз маральна-этычную ацэнку падзей і паводзін герояў. Мастацкі твор, яго жыццёва-пазнавальныя, мастацка-эстэтычныя, каштоўнасна-ацэначныя якасці — галоўны аб'ект увагі на ўроках літаратуры і на факультатыўных занятках. Пяцікласнікі спасцігаюць мастацкую прыроду, жанравае і тэматычнае багацце фальклорных і літаратурных твораў, авалодваюць *культурай чытання* (набываюць чытацкі вопыт, уменні бегла чытаць і аналізаваць творы розных жанраў) і *маўленчай культурай* (уменнямі эстэтычна ўспрымаць і выразна чытаць мастацкія тэксты з улікам іх жанравай спецыфікі, выконваць творчыя заданні, будаваць уласныя выказванні).

Сучасная праграма па літаратуры арыентуе настаўнікаў на тое, каб даць вучням неабходныя тэарэтычныя веды па выразным чытанні і сфарміраваць у іх пэўныя практычныя ўменні, разлічаныя на павышэнне чытальніцкага майстэрства, чытацкай і маўленчай культуры ў

цэлым. Аднак для дасягнення гэтых мэт школьных урокаў недастаткова. Факультатыў па роднай літаратуры дапаможа настаўніку вучыць школьнікаў выразна чытаць мастацкія творы розных жанраў, перадаваць голасам мелодыку і рытм верша, лагічны сэнс і сінтаксічны строй мовы.

Каб удасканаліць уласнае чытальніцкае майстэрства, вучню неабходна авалодаць цэлым комплексам *спецыяльных уменняў* — тэхнікай выразнага чытання (выпрацаваць фанацыйнае дыханне, правільнае вымаўленне, дасканалую дыкцыю, валоданне сваім голасам) — і *уменняў літаратурных* (эмацыянальна адгукацца на твор мастацтва слова, узнаўляць малюнкі і карціны, створаныя пісьменнікам, разумець матывіроўку паводзін герояў і суперажываць ім, арыентавацца ў сістэме вобразаў, правільна вызначаць мэты чытання, каб перадаць аўтарскую ацэнку рэчаіснасці, дзяліцца сваімі думкамі і пачуццямі). Падчас факультатыўных заняткаў будуць таксама развівацца і ўдасканальвацца ўменні пяцікласнікаў аналізаваць мастацкія творы, выконваць рэпрадуктыўныя і творчыя заданні, пераказваць літаратурны тэкст з максімальнай перадачай яго ідэйнай задумы, жанравых асаблівасцей, разуменнем пазіцыі аўтара і выяўленнем сваёй уласнай ацэнкі.

**Мэты** і **задачы** факультатыва:

• дапамагчы пяцікласнікам спасцігнуць тэматычную разнастайнасць і жанравую спецыфіку фальклорных і літаратурных твораў, асноўныя сродкі мастацкага выяўлення;

• развіваць эмацыянальную сферу, вобразнае мысленне вучняў, паглыбляць першаснае ўспрыманне мастацкага твора, вучыць разумець агульны пафас твора, узнаўляць вобразы, суперажываць выказаным пачуццям;

• удасканальваць практычныя ўменні школьнікаў (чытаць, пераказваць і аналізаваць мастацкія творы, супастаўляць іх па жанрах, тэмах, сюжэтах, вобразах, выяўленчых сродках мастацкай выразнасці, выказваць уласныя думкі, рабіць самастойныя вывады, абгрунтоўваць свае адносіны да герояў і падзей);

• сістэматызаваць і паглыбіць набытыя на ўроках мовы і літаратуры веды пяцікласнікаў пра культуру маўлення, тэхніку выразнага чытання, спрыяць паступоваму авалоданню майстэрствам выразнага чытання і расказвання, удасканальваць маўленчую культуру вучняў;

• абудзіць у пяцікласнікаў цікавасць да літаратурнай творчасці, паглыбіць іх уяўленне пра віды творчых прац па літаратуры, методыку іх падрыхтоўкі;

• падтрымліваць і развіваць цікавасць малодшых падлеткаў да розных відаў мастацтва (тэатра, музыкі, жывапісу), выхоўваць іх мастацкі густ;

• пашыраць чытацкую культуру пяцікласнікаў, фарміраваць устойлівы інтарэс да літаратуры як школьнага прадмета і да працэсу навучання у цэлым.

Методыка арганізацыі факультатыва надзвычай багатая і разнастайная: практыкуюцца тэарэтычныя і практычныя заняткі, розныя віды чытання твораў, творчыя работы па літаратуры: *пераказ* (падрабязны, сціслы, вольны — як запомнілася, выбраны, творчы — з працягам або са зменай апавядальніка), *адказ на праблемныя пытанні* і *выкананне творчых заданняў* (замалёўка, паведамленне, сачыненне з элементамі апісання і разважання, характарыстыка героя, міні-даследаванне, завочная экскурсія і інш.), *літаратурныя гульні, інсцэніраванне*.

Праграма зарыентавана на эстэтычны і творчы характар успрымання школьнікамі прапанаванага матэрыялу, на індывідуальна-асобасны падыход да навучання і ўлічвае ўзроставыя асаблівасці і інтэлектуальныя магчымасці пяцікласнікаў. Змест і структура раздзелаў праграмы факультатыва адпавядаюць раздзелам праграмы курса літаратуры для пятага класа. Праграма факультатыва акрэслівае фальклорныя і літаратурныя творы розных жанраў і ракурс іх разгляду, звесткі па тэорыі літаратуры, асноўныя віды творчых работ вучняў.

Праграма факультатыва разлічана на *35 гадзін* (1 гадзіна на тыдзень). Яна прапануе *прыкладнае* размеркаванне вучэбнай нагрузкі па прапанаваных тэмах. Настаўнік можа скарэкціраваць аб’ём тэарэтычнага і практычнага матэрыялу і пераразмеркаваць гадзіны, вызначыць віды і колькасць творчых заданняў па пэўнай тэме, зыходзячы з канкрэтных абставін. На факультатыўных занятках можна дадаткова скарыстаць творы, прапанаваныя праграмай па літаратуры для пазакласнага чытання, а таксама іншыя тэксты, абраныя настаўнікам або вучнямі (са згоды настаўніка). Пажадана выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі навучання: дыктафон або магнітафон для запісу і праслухоўвання чытання вучняў (пры магчымасці — майстроў мастацкага слова і саміх аўтараў), відэамагнітафон для прагляду асобных сцэн з тэатральных спектакляў і кінафільмаў, кінакамеру і інш.

Да факультатыўнага курса прапануецца спіс літаратуры.

# «БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЮ…»

*(35 гадзін)*

## І. Роднае слова

(*5 гадзін*)

### *Асновы выразнага чытання*

*(Літаратурная творчасць: адказы на пытанні, вуснае выказванне, вуснае сачыненне з элементамі разважання)*

***Тэма 1.*** **Уводзіны. Багацце беларускай мовы. Культура маўлення асобы**

Беларуская мова — нацыянальнае духоўнае багацце народа. Самабытнасць і арыгінальнасць беларускай мовы. Роля мовы ў жыцці грамадства. Беларускія пісьменнікі пра родную мову.

***Тэма 2.*** ***Якуб Колас.*** **«Слова — радасць, слова — чары...»;** ***Пятрусь Броўка.*** **«Багата, родная ты мова...»;** ***Пімен Панчанка.*** **«Родная мова»;** ***Ніл Гілевіч.*** **«Тут, між гэтых пагоркаў, у гэтых барах і дубровах...»;** ***Анатоль Грачанікаў.*** **«Мова...»**

Родная мова — захавальніца нацыянальнай патрыятычнай свядомасці, крыніца натхнення паэтаў. Заклапочанасць аўтараў лёсам беларускай мовы, захапленне яе багаццем, хараством, змястоўнасцю і эмацыянальнай выразнасцю, перададзеныя праз арыгінальныя вобразы. Экспрэсіўнасць выказванняў. Інтанацыйнае багацце вершаў. Мастацкая дасканаласць паэтычных вобразаў, створаных з дапамогай мастацкіх тропаў.

Аналіз і выразнае чытанне вершаў. Аналіз уласнага і чужога чытання (захаванне арфаэпічных нормаў, інтанаванне, выразнасць і эмацыянальнасць, тэмп).

## II. Вусная народная творчасць

*(11 гадзін)*

***Асновы культуры маўлення***

*(Літаратурная і мастацкая творчасць: складанне плана, пераказ, выразнае чытанне па ролях, інсцэніраванне, складанне загадак і казак, вуснае сачыненне-мініяцюра паводле прыказкі, ілюстраванне)*

***Тэма 3.*** **Прыказкі**

Паэтычнае асэнсаванне жыцця ў творах беларускага фальклору. Увасабленне мудрасці, адлюстраванне шматвяковога жыццёвага і працоўнага вопыту, псіхалогіі, светапогляду, маральна-этычных і эстэтычных ідэалаў народа. Ідэйна-тэматычны змест, абагульненасць, павучальнасць, асацыятыўнасць, пераносны сэнс прыказак. Іронія як істотная прыкмета прыказак.

Мастацкая дасканаласць прыказак: сцісласць і выразнасць, адметная будова, ёмістасць і яркасць мастацкіх вобразаў, лаканізм, трапнасць і выразнасць мовы. Народная педагогіка ў прыказках.

Калектыўная праца па падрыхтоўцы сачынення з элементамі разважання паводле прыказкі.

***Нормы літаратурнага вымаўлення. Тэхніка маўлення***

Арфаэпія. Асноўныя арфаэпічныя нормы беларускай мовы. Голас (дыяпазон, вышыня, тэмбр, сіла, палётнасць).

Дыкцыя. Значэнне выразнай дыкцыі ў вусным маўленні.

Дыханне і яго роля ў вусным маўленні, маўленчае дыханне.

Практыкаванні па артыкуляцыі (чысціня і выразнасць гукаў). Практыкаванні па дыкцыі. Практыкаванні па дыханні.

Падзел тэкстаў прыказак на маўленчыя часткі. Складанне партытуры чытання. Выразнае чытанне прыказак.

***Тэма 4.*** **Загадкі**

Паходжанне і тэматычнае багацце загадак. Паэтычнае асэнсаванне свету ў загадках. Будова загадак па прынцыпе супастаўлення прадметаў рэчаіснасці паводле іх знешніх і ўнутраных якасцей (па форме, колеры, гуку, выніках дзеяння, паводзінах, характары руху і інш.). Іншасказальны характар загадак. Літаратурныя загадкі.

Мастацкая дасканаласць і выразнасць формы, лаканізм, дасціпнасць і мудрасць загадак. Роля загадак у развіцці фантазіі, вобразнага мыслення, назіральнасці, кемлівасці, знаходлівасці чалавека.

Загадванне і адгадванне загадак, калектыўнае складанне загадак.

***Логіка маўлення. Лагічная паўза. Лагічны націск***

Маўленчыя такты. Сродкі лагічнай выразнасці маўлення (націск, паўзы, мелодыка). Паўза, мелодыка і знакі прыпынку.

Лагічныя паўзы. Паўзы, звязаныя з вершаванай мовай. Працягласць паўз. Графічнае абазначэнне паўз.

Лагічны націск — ключ для разумення фразы. Графічнае абазначэнне лагічнага націску.

Падзел тэкстаў загадак на маўленчыя часткі, расстаноўка паўз, вызначэнне лагічнага націску.

***Тэма 5.*** **Прыкметы**

Увасабленне ў прыкметах вопыту і мудрасці народа. Спасціжэнне чалавекам навакольнага свету і ўсведамленне свайго месца ў ім. Дарадчая, перасцерагальная, забаронная функцыі прыкмет, іх скіраванасць на паляпшэнне дабрабыту працоўнага чалавека. Трапнасць, афарыстычнасць мовы прыкмет, іх блізкасць да загадак, прыказак.

Калектыўная творчая работа (вусная замалёўка або вуснае сачыненне з элементамі апісання) па абраных прыкметах.

***Інтанацыя***

Інтанацыя пры знаках прыпынку. Мелодыка маўлення. Інтанацыя апавядальная, пытальная, клічная. Перадача сродкамі інтанацыі асаблівасцей розных канструкцый сказаў. Графічнае абазначэнне элементаў выразнага чытання. Роля інтанацыі ў вусным маўленні. Залежнасць інтанацыі і сілы голасу ад мэты выказвання.

Падзел тэкстаў прыкмет на маўленчыя часткі, расстаноўка паўз, вызначэнне лагічнага націску, аналіз інтанацыі.

***Тэма 6.*** **Легенда *«Лебядзёўка»***

Гісторыя паходжання вёскі Лебядзёўка. Старадаўнія традыцыі мясцовых жыхароў, іх стаўленне да лебедзяў, што жылі на возеры. Лебедзі як сімвал гордасці, мудрасці, працавітасці. Вобразы Варажбіткі і Нічыпара — лайдака і прайдзісвета. Фантастычнае і чароўнае ў народнай легендзе. Лаканічнасць і мастацкая выразнасць мовы твора.

Вызначэнне асноўных эпізодаў, складанне плана, вусны вольны пераказ легенды.

***Тэма 7.*** **Народныя казкі**

Асаблівасці зместу, сістэма вобразаў, характэрныя прыёмы мастацкага адлюстравання ў народных казках. Шырыня ахопу жыццёвых з'яў, глыбіня абагульнення, яркасць вобразаў. Супрацьстаянне дабра і зла — пастаянны матыў народных казак. Павучальны сэнс народных казак. Мастацкая выдумка ў казках. Віды народных казак: чарадзейныя, бытавыя, казкі пра жывёл.

*Казка* ***«Чаму барсук і лісіца ў норах жывуць»***

Асноўная калізія казкі — выбар ляснымі жыхарамі сабе хвастоў. Казачныя персанажы — леў, барсук, ліса, мядзведзь, вавёрка, куніца, конь, лось, заяц — і іх характары. Кампазіцыйная завершанасць казкі, рытмізаваная мова, шырокае ўжыванне трапных выслоўяў. Разгорнуты дыялог.

*Чарадзейная казка* ***«Андрэй за ўсіх мудрэй»***

Захапляльнасць, напружанасць, дынамізм сюжэта, нечаканасць яго паваротаў. Вобраз Андрэя — цікаўнага і спагадлівага хлопца. Станоўчыя і варожыя персанажы. Мастацкая гіпербала як сродак характарыстыкі герояў. Чароўныя і цудадзейныя прадметы і іх роля ў развіцці казачнага дзеяння. Паэтыка казкі.

Выразнае чытанне, складанне плана, пераказ казкі або яе асобных эпізодаў. Калектыўнае складанне чарадзейнай казкі (з выкарыстаннем знаёмых казачных сюжэтаў і вобразаў) і спроба мастацкага расказвання казкі.

*Бытавая казка* ***«Як Сцёпка з панам гаварыў»***

Займальнасць сюжэта. Выяўленне мудрасці, кемлівасці, дасціпнасці ў вобразе мужыка Сцёпкі. Роля выдумкі і фантазіі, характар канфлікту. Адметнасці стылю і вобразнай сістэмы бытавой казкі. Індывідуалізацыя мовы персанажаў. Дыялог як сродак характарыстыкі герояў. Мараль у бытавой казцы. Гумар у казцы, яе падабенства да анекдота.

Чытанне казкі па ролях, інсцэніроўка фрагмента казкі.

***Эмацыянальна-вобразная выразнасць маўлення***

Аснова эмацыянальна-вобразнай выразнасці маўлення — перадача (пры чытанні, пераказе, адказах на пытанні) пачуццяў, думак, ацэнак, эмацыянальна-валявых памкненняў вучняў. Сродкі выразнасці

маўлення: сіла гука, вышыня гука, тэмбр, тэмп, тон маўлення. Павышэнне і паніжэнне тона.

Практыкаванні па тэхніцы і логіцы маўлення, па развіцці творчага ўяўлення, уменні звяртацца да слухачоў з мэтай перадачы сваіх думак, эмоцый, пачуццяў. Формы зносін з аўдыторыяй.

## III. Казка — у жыцці падказка

*(5 гадзін)*

*(Літаратурная і мастацкая творчасць: творчы пераказ з працягам, вуснае выказванне, вуснае сачыненне з элементамі разважання, ілюстраванне)*

***Тэма 8.*** ***Міхаіл Савіцкі.*** **«Прыгоды Муркі» (урыўкі)**

Рэальна-жыццёвая аснова літаратурнай аповесці-казкі, займальнасць сюжэта. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы персанажаў, псіхалагізм у раскрыцці характараў. Прырода ў творы. Вобраз апавядальніка.

Выразнае чытанне асобных фрагментаў тэксту (апісанняў і дыялогаў), складанне плана, творчы пераказ (з працягам).

***Тэма 9.*** ***Ханс Крысціян Андэрсен.*** **«Ёсць жа розніца!»**

Алегарычна-філасофскі змест казкі. Маральна-этычныя праблемы ў творы. Фанабэрыстасць, легкадумнасць яблыневай галінкі, яе стаўленне да звычайных раслін. Сонечны прамень як увасабленне мудрых, разважлівых адносін да жыцця. Вобразы маладой графіні і старой бабулі, іх адносіны да кветак. Сродкі мастацкай выразнасці ў казцы. Аўтар-апавядальнік ў творы.

Выразнае чытанне асобных эпізодаў (дыялогаў), вольны пераказ казкі (як запомнілася), характарыстыка персанажаў, ілюстрацыі да твора.

## IV. Прыроды вечная краса

*(5 гадзін)*

*(Літаратурная і мастацкая творчасць: вуснае маляванне словамі, творчы пераказ, вуснае калектыўнае сачыненне па карціне, вуснае сачыненне з элементамі апісання)*

***Тэма 10.*** ***Янка Купала.*** **«Дуб»;** ***Пімен Панчанка.*** **«Красавіцкая навальніца»;** ***Хведар Жычка.*** **«За ягадным лесам»;** ***Янка Сіпакоў.*** **«Чым пахне дождж» (урывак з рамана «Даверлівая зямля»);**

***Еўдакія Лось.*** **«Мінулагодні ліст»;** ***Вера Вярба.*** **«Схіляецца ніва да самай зямлі…»;** ***Кузьма Чорны.*** **«На схіле восені»**

Майстэрства аўтараў у перадачы колеравай і гукавой гамы навакольнага свету. Замілаванне харством роднай прыроды. Тонкасць паэтычнага светаадчування. Адухоўленасць карцін прыроды. Эмацыянальная пранікнёнасць, цеплыня, задушэўнасць выказванняў, даверлівасць інтанацыі. Вобразнасць, выразнасць і пластычнасць мовы твораў.

Аналіз рэпрадукцый карцін беларускіх мастакоў (Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Паўла Масленікава, Эдуарда Рымаровіча, Уладзіміра Сулкоўскага, Уладзіміра Савіча, Міколы Купавы і іншых пейзажыстаў — на выбар настаўніка).

Параўнальны аналіз пейзажу ў творах літаратуры і жывапісу. Вуснае калектыўнае сачыненне па карціне.

***Аналіз і выразнае чытанне прыродаапісальных вершаваных твораў***

Вызначэнне ўсіх кампанентаў твора (настраёвасць, аўтарскія пачуцці і перажыванні, вобразы, будова). Падрыхтоўка партытуры чытання, удакладненне выканальніцкай задачы. Вуснае маляванне словамі.

***Аналіз і выразнае чытанне прыродаапісальных празаічных твораў***

Аналіз, складанне партытуры чытання, выразнае чытанне пейзажнай замалёўкі. Пераказ паводле апісання. Вуснае сачыненне-мініяцюра з элементамі апісання.

## V. Жыццёвымі сцежкамі

*(6 гадзін)*

*(Літаратурная і мастацкая творчасць:
выразнае чытанне, пераказ, адказы на пытанні,
вуснае сачыненне з элементамі разважання, ілюстраванне)*

***Тэма 11.*** ***Вячаслаў Адамчык.*** **«Сонечны зайчык»**

Трагічнаё жыццё кошкі. Значэнне гісторыі жывёліны ў раскрыцці мастацкай ідэі апавядання. Напружанасць сюжэта. Гуманістычны пафас твора. Ідэя дабрыні і міласэрнасці да прыроды. Псіхалагізм у раскрыцці характараў. Асоба аўтара-апавядальніка ў творы.

Пераказ асобных эпізодаў, адказы на праблемныя пытанні, вуснае сачыненне з элементамі апісання і разважання пра сваю хатнюю жывёліну.

***Тэма 12.*** ***Янка Маўр.*** **«Шчасце»**

Рэальна-жыццёвая аснова апавядання. Адкрытасць, даверлівасць хлопчыка. Асоба аўтара-апавядальніка ў творы. Майстэрства пісь-

менніка ў абмалёўцы душэўнага стану герояў. Мяккі лірызм аповеда. Роля пейзажу ў творы.

Вусная замалёўка пра аднаго з герояў твора (на выбар вучняў).

***Тэма 13.*** ***Янка Брыль.*** **«Маці»**.

Трагічнае гучанне твора. Кантрастнасць і эмацыянальная сугучнасць карцін прыроды і стану душы маці. Прыёмы абмалёўкі характараў маці і яе сына Сцяпана. Драматызм, напружанасць сюжэта. Роля заключнага эпізоду ў раскрыцці тэмы.

***Аналіз і выразнае чытанне празаічных твораў***

Вызначэнне тэмы і ідэі, месца і часу дзеяння, характарыстыка вобразаў, сродкаў іх стварэння (апісанні прыроды, інтэр'ера, знешняга выгляду; аналіз учынкаў і перажыванняў, матывіроўка паводзін, аўтарская характарыстыка), ацэнка твораў вучнямі.

## VI. Прыгоды

*(2 гадзіны)*

*(Літаратурная і мастацкая творчасць:*
*выразнае чытанне, творчы пераказ, інсцэніраванне,*
*вуснае выказванне з абгрунтаваннем уласнай ацэнкі,*
*калектыўнае складанне прыгодніцкага твора)*

***Тэма 14.*** ***Міхась Лынькоў.*** **«Прыгоды Міколкі з дзедам Астапам» (урывак з аповесці «Міколка-паравоз»)**

Прыгодніцкі характар твора. Займальнасць сюжэта. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы характараў Міколкі і дзеда Астапа. Раскрыццё характараў праз дыялогі. Роля гумарыстычных элементаў у выяўленні аўтарскіх адносін да герояў.

Выразнае чытанне дыялогаў, вуснае выказванне з абгрунтаваннем уласнай ацэнкі твора, інсцэніраванне.

## Конкурс на лепшага чытальніка

*(1 гадзіна)*

**Чакаемыя вынікі факультатыўнага курса:**

Пяцікласнікі павінны ***ведаць:***

• аўтараў, назвы і змест разгледжаных твораў;

• асноўныя жанравыя ўласцівасці фальклорных твораў — прыказак, загадак, прыкмет і павер'яў, народных казак і легенд;

• асноўныя жанравыя ўласцівасці мастацкіх твораў — літаратурных казак, лірычных вершаў, апавядання, аповесці;

• выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці.

Пяцікласнікі павінны ***умець:***

• выразна, у патрэбным тэмпе і з захаваннем адпаведнай інтанацыі чытаць фальклорныя і літаратурныя творы розных жанраў, разумеючы іх агульную настраёвасць, асэнсоўваючы пафас, пазіцыю аўтара і выяўляючы свае адносіны да адлюстраванага;

• узнаўляць мастацкія карціны і вобразы;

• валодаць усімі відамі пераказу (умець падрабязна, сцісла, вольна — як запомнілася, выбарачна або творча пераказваць апавядальны твор ці ўрывак з яго);

• характарызаваць героя па яго паводзінах і ўчынках ці ў святле пастаўленага настаўнікам пытання; параўноўваць герояў аднаго або некалькіх твораў;

• даваць маральную ацэнку ўчынкам і паводзінам героя і выяўляць яе пры чытанні, пераказе, адказе на пытанне;

• рыхтаваць вусныя замалёўкі, паведамленні, сачыненні з элементамі апісання і разважання на зададзеную тэму;

• асэнсоўваць свае ўражанні, эмоцыі, пачуцці;

• інсцэніраваць фрагмент п’есы, казкі, эпізод з апавядання або аповесці, прадумваючы рэплікі і дыялогі герояў, аўтарскія рэмаркі, дэкарацыі, касцюмы.

# ДАПАМОЖНІК ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

## УВОДЗІНЫ

Факультатыўны курс па літаратуры ў пятым класе «Браму скарбаў сваіх адчыняю…» скіраваны на спасціжэнне вучнямі чалавеказнаўчага аспекту літаратуры — пазнання свету і чалавека праз мастацкае, эстэтычнае іх адлюстраванне і ўспрыманне, праз мастацка-эстэтычную ацэнку рэчаіснасці, жыццёвых з'яў і падзей, — а таксама на развіццё іх чытацкай і маўленчай культуры і творчай актыўнасці.

Курс пятага класа ў агульнай сістэме літаратурнай адукацыі ў школе займае асобае месца як пераходны ад пачатковага этапу навучання (літаратурнае чытанне) да сярэдняга (літаратурнае навучанне). Літаратурная адукацыя ў пятым класе скіравана на фарміраванне ў вучняў уяўлення пра літаратуру як мастацтва слова, якому ўласцівы спецыфічныя спосабы адлюстравання жыцця.

Змест факультатыва «Браму скарбаў сваіх адчыняю…» складаюць:

а) тэарэтычныя звесткі пра асобныя фальклорныя і літаратурныя жанры, структуру і будову мастацкага твора, а таксама асноўныя сродкі мастацкага выяўлення;

б) тэксты фальклорных і літаратурных твораў розных жанраў;

в) асноўныя тэарэтычныя і практычныя звесткі пра культуру чытання і маўлення;

г) сістэма вопыту літаратурнай творчасці пяцікласнікаў.

Змест і структура раздзелаў праграмы, дыдактычных і метадычных і матэрыялаў прапанаванага факультатыва цалкам суадносяцца з курсам літаратуры пятага класа. Факультатыў ставіць мэтай зацікавіць дзяцей чытаннем, абудзіць у іх увагу да мастацкай прыроды фальклорных і літаратурных твораў розных жанраў, навучыць успрымаць літаратуру як мастацтва. У праграму і дыдактычныя матэрыялы факультатыва ўключаны творы, якія адлюстроўваюць рэчаіснасць з усім багаццем чалавечых характараў, пачуццяў, перажыванняў, ду-

хоўных запатрабаванняў і пошукаў герояў, а таксама свет прыроды з яго фарбамі, колерамі, гукамі. У межах раздзелаў, арганізаваных па мастацка-эстэтычных асаблівасцях, захоўваюцца тэматычныя блокі, каб былі магчымасць і падставы для параўнання твораў розных аўтараў (па тэмах, праблемах, вобразах, спосабах абмалёўкі характараў, па форме, настроі, пафасе і г. д.). Па тэорыі літаратуры замацоўваюцца паняцці, у асноўным звязаныя з мастацкім творам і яго кампанентамі. Мастацкія творы спрыяюць засваенню пэўнага блока літаратуразнаўчых паняццяў. Тэксты разнастайныя па змесце і форме — ад фальклорных твораў розных жанраў да тэкстаў рэалістычнай і фантастычнай скіраванасці.

Прыкладнае тэматычнае планаванне вучэбнага матэрыялу факультатыва «Браму скарбаў сваіх адчыняю...» падаецца ў адпаведнасці са зместам і структурай праграмы факультатыва. Мастацкія творы, прадстаўленыя ў раздзелах дыдактычнага дапаможніка (I. Роднае слова; II. Вусная народная творчасць; III. Казка — у жыцці падказка; IV. Прыроды вечная краса; V. Жыццёвымі сцежкамі; VI. Прыгоды), даюць магчымасць шырокага агляду жыцця, пранікнення ў самыя разнастайныя сферы, выяўляюць важнейшыя грамадзянскія, маральна-этычныя і эстэтычныя каштоўнасці характару і паводзін чалавека. Факультатыў мае на мэце пашырыць чытацкі досвед пяцікласнікаў, замацаваць, сістэматызаваць і паглыбіць веды і ўменні школьнікаў, набытыя на ўроках роднай літаратуры. У сваёй штодзённай працы выкладчык факультатыва будзе дбаць пра выхаванне эмацыянальнай чуйнасці пяцікласнікаў, увагі да слова і вобраза, пра развіццё іх вобразнага ўяўлення і фантазіі, фарміраванне аналітычных і творчых здольнасцей і выхаванне маўленчай культуры.

Вуснае маўленне пяцікласнікаў (чытанне, адказы на пытанні, розныя віды пераказу, маляванне словамі, сачыненне з элементамі аповеда, апісання, разважання і інш.) павінна быць змястоўным, зразумелым, пераканальным, эмацыянальным. У працэсе публічнага выказвання асаблівую значнасць маюць індывідуальнасць прамоўцы, багацце яго слоўнікавага запасу, веданне ім норм літаратурнага вымаўлення, змястоўнасць, лагічнасць, эмацыянальнасць выказвання. У сваю чаргу, слухачы вучацца не толькі слухаць, асэнсоўваць і ацэньваць пачутае, але і па неабходнасці ўдзельнічаць у калектыўным абмеркаванні. Навучанне выразнаму чытанню і вуснаму маўленню павінна быць планамерным, сістэмным, узыходзіць па ступенях цяжкасці ад элементарнага, простага да больш складанага.

Сучасная праграма па літаратуры арыентуе настаўнікаў на тое, каб даць вучням неабходныя тэарэтычныя веды па выразным чытанні і сфарміраваць у іх пэўныя практычныя ўменні, разлічаныя на павышэнне чытальніцкага майстэрства, чытацкай і маўленчай культуры

ў цэлым. Аднак для дасягнення гэтых мэт школьных урокаў недастаткова, і факультатыў паспрыяе настаўніку ў яго працы.

Прапанаваныя метадычныя парады носяць канцэптуальны характар і выяўляюць толькі некаторыя (на наш погляд, асноўныя) накірункі працы выкладчыка факультатыва, агульны ракурс разгляду мастацкіх твораў з улікам іх родава-жанравай спецыфікі (з выхадам на аналіз паасобных мастацкіх тэкстаў).

# ПРЫКЛАДНАЕ ТЭМАТЫЧНАЕ ПЛАНАВАННЕ ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*(35 гадзін)*

## I. Роднае слова

*(5 гадзін)*

### *Асновы выразнага чытання*

***Тэма 1.*** **Уводзіны. Багацце беларускай мовы. Культура маўлення асобы.** *(1 гадзіна)*

**Беларуская мова** — нацыянальнае духоўнае багацце народа. Самабытнасць і арыгінальнасць беларускай мовы. Роля мовы і літаратуры ў жыцці грамадства. Беларускія пісьменнікі пра родную мову.

*Мэты і задачы:*

• узнавіць, сістэматызаваць і паглыбіць папярэдне набытыя вучнямі веды пра беларускую мову і яе ролю ў жыцці грамадства, пра літаратуру як мастацтва слова і яе пазнавальнае і выхаваўчае значэнне;

• пазнаёміць пяцікласнікаў з трапнымі народнымі выслоўямі пра беларускую мову і ролю кнігі ў жыцці чалавека і садзейнічаць іх асэнсаванню;

• дапамагчы адчуць (на матэрыяле паэтычных шэдэўраў) мілагучнасць, выразнасць, прыгажосць роднай мовы, яе самабытнасць і непаўторнасць;

• абудзіць цікавасць да самастойнага чытання мастацкай літаратуры і жаданне школьнікаў пашыраць свой досвед і развіваць творчыя здольнасці і магчымасці.

***Тэма 2.*** ***Якуб Колас.*** **«Слова — радасць, слова — чары...»;** ***Пятрусь Броўка.*** **«Багата, родная ты мова...»;** ***Пімен Панчанка.*** **«Родная мова»;** ***Ніл Гілевіч.*** **«Тут, між гэтых пагоркаў, у гэтых барах і дубровах...»;** ***А. Грачанікаў.*** **«Мова...»** *(4 гадзіны)*

Родная мова — захавальніца нацыянальнай свядомасці народа, аснова фарміравання духоўнасці і маральнай дасканаласці чалавека, крыніца натхнення пісьменнікаў. Замілаванне паэтаў багаццем, хараством, змястоўнасцю і эмацыянальнай выразнасцю беларускай мовы, перададзенае праз арыгінальная эпітэты, параўнанні, метафары. Заклапочанасць аўтараў лёсам беларускай мовы.

*Мэты і задачы:*

• выявіць шматграннасць чалавечых пачуццяў і думак, выказаных у вершах: захапленне аўтараў меладычнасцю, пяшчотай, трапнасцю і выразнасцю роднай мовы; гонар за высокія маральныя якасці беларускага нацыянальнага характару — гасціннасць, добразычлівасць, шчодрасць, спагадлівасць і інш.);

• фарміраваць уменні вучняў узнаўляць паэтычныя вобразы і карціны, аналізаваць вершаваны тэкст, супастаўляць тэматычна блізкія вершы (па змесце, гучанні, настроі, аўтарскіх пачуццях, вобразах, будове, інтанацыі і інш.), асэнсоўваць аўтарскую пазіцыю, выказваць уласныя адносіны да твораў і абгрунтоўваць сваю ацэнку;

• вучыць асэнсавана і выразна чытаць паэтычныя творы (разумець пафас, спасцігаць вобразны лад, інтанацыйнае багацце, адчуваць меладыку верша).

## II. Вусная народная творчасць

*(11 гадзін)*

### *Асновы культуры маўлення*

*Тэма 3.* **Прыказкі.** *(2 гадзіны)*

Паэтычнае асэнсаванне жыцця ў вуснай народнай творчасці. Увасабленне мудрасці, адлюстраванне жыццёвага і працоўнага вопыту, псіхалогіі, светапогляду, маральна-этычных і эстэтычных ідэалаў народа. Ідэйна-тэматычны змест, абагульненасць, павучальнасць, асацыятыўнасць, падтэкст. Дасціпнасць і афарыстычнасць прыказак. Іронія як істотная прыкмета прыказак.

Мастацкая дасканаласць прыказак: кампазіцыя, ёмістасць і яркасць мастацкіх вобразаў, лаканізм, трапнасць і выразнасць мовы. Тэматычная разнастайнасць прыказак. Народная педагогіка ў прыказках.

Калектыўная праца па падрыхтоўцы вуснага выказвання ці сачынення з элементамі разважання паводле прыказкі.

*Мэты і задачы:*

• узнавіць і паглыбіць веды вучняў пра вусную народную творчасць і народныя прыказкі, дапамагчы зразумець іх паходжанне

і жанравыя асаблівасці (сцісласць, выразнасць, трапнасць, афарыстычнасць, пераносны сэнс, павучальны змест);

• узнавіць і замацаваць веды пяцікласнікаў пра асноўныя нормы літаратурнага вымаўлення, атрыманыя на ўроках беларускай мовы, вучыць дзяцей вызначаць у тэксце (на прыкладах асобных прыказак) змястоўную ролю паўз, расстаўляць лагічныя націскі, складаць партытуру чытання;

• вучыць выразна і асэнсавана чытаць і аналізаваць прыказкі, разумець іх падтэкст, вызначаць тэматычную дамінанту;

• рыхтаваць вусныя выказванні (з выкарыстаннем прыказак) на вызначаную тэму, ствараць уласныя замалёўкі паводле прапанаванага выслоўя.

***<u>Тэма 4.</u>*** **Загадкі.** *(2 гадзіны)*

Паходжанне і тэматычнае багацце загадак. Паэтычнае асэнсаванне свету ў загадках. Будова загадак па прынцыпе параўнання, супастаўлення прадметаў і з'яў рэчаіснасці паводле іх знешніх і ўнутраных якасцей (па форме, колеры, выніках дзеяння, паводзінах, характары руху і інш.). Іншасказальны характар загадак.

Мастацкая дасканаласць і выразнасць формы, дасціпнасць і мудрасць загадак. Іх роля ў развіцці фантазіі, мастацка-вобразнага мыслення, назіральнасці, кемлівасці, знаходлівасці чалавека. Літаратурныя загадкі. Загадванне і адгадванне загадак.

Адгадванне загадак, іх аналіз, калектыўнае стварэнне новых загадак.

*Мэты і задачы:*

• узнавіць, паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў пра загадкі, набытыя ў пачатковай школе і на ўроках літаратуры;

• нагадаць пяцікласнікам пра ўзнікненне і першапачатковае прызначэнне загадак у грамадстве, паказаць іх мастацкія адметнасці і ўласцівасці (дасціпнасць, мудрасць, іншасказальнасць, лаканізм, дасканаласць формы, гумар);

• удасканальваць уменні вучняў асэнсоўваць, аналізаваць і адгадваць загадкі і выразна іх чытаць (дзяліць на сэнсавыя часткі, вызначаць лагічныя націскі і расстаўляць лагічныя і псіхалагічныя паўзы), звяртаючы ўвагу на арыгінальнасць формы, адметную будову, вобразны лад;

• пазнаёміць пяцікласнікаў з прынцыпамі стварэння загадак і вучыць ствараць уласныя загадкі.

***<u>Тэма 5.</u>*** **Прыкметы.** *(1 гадзіна)*

Спасціжэнне чалавекам навакольнага свету і ўсведамленне свайго месца ў ім. Дарадчая, перасцерагальная, забаронная функцыі пры-

кмет , іх скіраванасць на паляпшэнне дабрабыту працоўнага чалавека. Трапнасць, афарыстычнасць мовы прыкмет, іх блізкасць да загадак і прыказак.

Калектыўная творчая работа (сачыненне з элементамі апісання) па народных прыкметах.

*Мэты і задачы:*

• абагульніць і паглыбіць веды вучняў пра народныя прыкметы, іх узнікненне, прызначэнне, функцыі (дарадчую, перасцерагальную, забаронную):

• дапамагчы пяцікласнікам спасцігнуць афарыстычнасць і трапнасць народных прыкмет, іх скіраванасць на паляпшэнне дабрабыту працоўнага чалавека;

• паказаць блізкасць прыкмет да загадак і прыказак;

• дапамагчы падрыхтаваць калектыўнае вуснае выказванне ці сачыненне з элементамі апісання;

• вучыць дзяліць выслоўі на маўленчыя часткі, расстаўляць лагічныя і псіхалагічныя паўзы, аналізаваць інтанацыю, графічна абазначаць элементы выразнага чытання, складаць яго партытуру, выразна чытаць выслоўі.

***<u>Тэма 6.</u>* Легенда *«Лебядзёўка».*** *(1 гадзіна)*

Выяўленне душэўнай чэрствасці і хціваcці селяніна Нічыпара. Займальны характар сюжэта твора. Фантастычнае і чароўнае ў легендзе. Лаканічнасць і мастацкая выразнасць мовы твора.

*Мэты і задачы:*

• узнавіць і пашырыць веды вучняў пра легенду як фальклорны жанр (наяўнасць элементаў фантастыкі: неверагодныя здарэнні, незвычайныя героі, дзівосныя прыгоды і г. д.);

• засяродзіць увагу пяцікласнікаў на мастацкай выразнасці легенд, багацці бытавых і сацыяльных рэалій, спосабах абмалёўкі вобразаў, даступнасці зместу і лаканізме формы;

• дапамагчы зразумець характары персанажаў і асэнсаваць павучальны змест твора;

• прааналізаваць лексіку твора, лаканізм сродкаў у абмалёўцы знешнасці і характараў герояў;

• развіваць уменне вучняў расказваць легенды, карыстаючыся адпаведнай лексікай, захоўваючы эмацыянальнае гучанне, нетаропкасць аповеда.

Складанне плана, пераказ легенды, адказы на пытанні.

***<u>Тэма 7.</u>* Народныя казкі.** *(5 гадзін)*

Асаблівасць зместу, сістэма вобразаў, характэрныя прыёмы мастацкага адлюстравання ў народных казках. Мастацкая выдумка

ў казках. Шырыня ахопу жыццёвых з'яў, глыбіня абагульнення, яркасць вобразаў. Супрацьстаянне дабра і зла — пастаянны матыў народных казак. Дыдактычна-павучальны сэнс народных казак.

***Казкі пра жывёл*. «Чаму барсук і лісіца ў норах жывуць»**

Вобразы казачных персанажаў. Кампазіцыйная завершанасць, рыфмаваная і рытмізаваная мова, шырокае ўжыванне прыказак, мянушак. Разгорнуты дыялог.

Выразнае чытанне па асобах і пераказ казкі.

***Чарадзейныя казкі. «Андрэй за ўсіх мудрэй»***

Захапляльнасць, напружанасць, дынамізм сюжэта, нечаканасць яго паваротаў. Сацыяльны канфлікт як аснова сюжэта. Станоўчыя і варожыя вобразы. Мастацкая гіпербала як сродак характарыстыкі герояў. Чароўныя і цудадзейныя прадметы. Казачная паэтыка.

Калектыўнае складанне чарадзейнай казкі (з выкарыстаннем знаёмых сюжэтаў і вобразаў, захаваннем асноўных прынцыпаў будовы народных казак, выкарыстаннем адпаведнай лексікі).

***Сацыяльна-бытавыя казкі*. «Як Сцёпка з панам гаварыў»**

Займальнасць сюжэта. Выяўленне мудрасці, кемлівасці, дасціпнасці, знаходлівасці мужыка Сцёпкі. Роля выдумкі і фантазіі, характар канфлікту. Адметнасці стылю і вобразнай сістэмы бытавой казкі. Індывідуалізацыя мовы персанажаў. Дыялог як сродак характарыстыкі герояў. Мараль у бытавой казцы. Гумар у казцы і яе падабенства да анекдота.

Чытанне дыялогаў па асобах, інсцэніроўка фрагмента казкі.

*Мэты і задачы:*

• узнавіць, замацаваць і прывесці ў сістэму набытыя вучнямі веды вучняў пра народныя казкі, іх віды (чарадзейныя, бытавыя, пра жывёл) і жанравыя адметнасці (будову, сюжэт, канфлікт, характары, спецыфічную лексіку);

• навучыць вызначаць тэматычную дамінанту казкі, заўважаць адметнасці яе будовы, асноўны канфлікт, своеасаблівую лексіку (багацце трапных выслоўяў, паўторы і інш.), адсутнасць мастацкіх апісанняў, статычнасць характараў;

• выдзяляць эпізоды, важныя для характарыстыкі казачных герояў, разумець сутнасць канфлікту;

• аналізаваць паводзіны казачных персанажаў паводле выяўлення маральных каштоўнасцей (працавітасці, смеласці, настойлівасці ў дасягненні мэты і пераадоленні жыццёвых нягод і выпрабаванняў, дабрыні і спагадлівасці, адданасці і вернасці ў сяброўстве);

• паглыбіць уяўленне пра мастацкую гіпербалу як сродак характарыстыкі казачных персанажаў;

• вучыць аналізаваць адметнасці будовы казкі і заўважаць элементы чарадзейнага ў ёй («Андрэй за ўсіх мудрэй»);

• садзейнічаць спасціжэнню вучнямі выхаваўчай ідэі фальклорнай казкі;

• развіваць уменні вучняў перадаваць напружанасць дзеяння пры чытанні, аднаўляць паслядоўнасць падзей пры вусным пераказе;

• выпрацоўваць уменні расказваць і выразна чытаць казкі, пабудаваныя на дыялогах (звяртаючы ўвагу на індывідуалізацыю мовы персанажаў, стоены гумар і сродкі яго выяўлення ў казцы);

• дапамагчы падрыхтаваць інсцэніроўку казкі, аналізуючы характары і паводзіны герояў, іх знешні выгляд, манеру гаварыць і трымаць сябе, а таксама інтанацыю, жэсты, міміку вучняў-выканаўцаў («Як Сцёпка з панам гаварыў»);

• прыўнесці ў навучальны працэс элементы займальнасці, творчасці, спаборніцтва (расказаць уласную казку — можна з выкарыстаннем вядомых фальклорных сюжэтаў і вобразаў, — самастойна прачытаную легенду, загадаць некалькі загадак, скласці вусную замалёўку па абранай прыказцы, падрыхтаваць і пракаменціраваць уласныя ілюстрацыі да аднаго з фальклорных твораў, падрыхтаваць інсцэніроўку аднаго з эпізодаў абранай казкі — на выбар вучняў);

• наладзіць выставу ілюстраваных кніг казак, легенд, загадак, а таксама вучнёўскіх ілюстрацый да фальклорных твораў.

## III. Казка — у жыцці падказка

*(5 гадзін)*

### *Асновы літаратурнай творчасці*

*__Тэма 8.__* ***Міхаіл Савіцкі.*** **«Прыгоды Муркі» (урывак).** *(3 гадзіны)*

Рэальна-жыццёвая аснова казкі, прыгодніцкі характар і займальнасць сюжэта. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы персанажаў, псіхалагізм ў раскрыцці вобразаў. Прырода ў творы. Арыгінальнасць асобы апавядальніка — кошкі Муркі, яе характар і стаўленне да падзей.

*Мэты і задачы:*

• пашырыць уяўленні пяцікласнікаў пра літаратурную казку, яе падабенства да народнай казкі (наяўнасць казачнай калізіі, сутыкненне дабра і зла з абавязковай перамогай дабра, адметная лексіка, падзел герояў на станоўчых і адмоўных) і да літаратурнай прозы (шматграннасць характараў і разнастайнасць спосабаў іх абмалёўкі: партрэтная характарыстыка, адметнасці мовы, апісанне перажыванняў (унутраныя маналогі), матывіроўка паводзін і стасункі з іншымі персанажамі, наяўнасць пейзажных апісанняў, іх узаемасувязь з псіхалагічным станам герояў і інш.);

• выявіць непасрэдныя вучнёўскія ўражанні ад твора, асноўную ўвагу засяродзіць на аналізе вобраза Муркі і спосабах яго абмалёўкі;

• вучыць цэласна ўспрымаць сюжэт, вызначаць паслядоўнасць падзей, выяўляць ключавыя эпізоды, важныя для характарыстыкі герояў;

• развіваць уменне суадносіць учынкі персанажаў і матывы іх паводзін, разумець функцыянальную ролю партрэта героя ў творы.

***<u>Тэма 9</u>. Ханс Крысціян Андэрсен.* «Ёсць жа розніца!»** *(2 гадзіны)*

Алегарычна-філасофскі змест казкі. Маральна-этычныя праблемы ў творы. Фанабэрыстасць, легкадумнасць яблыневай галінкі, яе стаўленне да звычайных раслін. Вобраз графіні. Сродкі мастацкай выразнасці ў казцы. Аўтар-апавядальнік ў творы.

*Мэты і задачы:*

• дапамагчы спасцігнуць алегарычны змест казкі, яе філасофскі падтэкст, будову, жанравыя адметнасці, вобразны лад, багацце сродкаў мастацкага выяўлення;

• удасканальваць аналітычныя ўменні пяцікласнікаў пры разглядзе празаічнага твора, скіраваць іх увагу на характары персанажаў (добрай і разважлівай графіні, прыгожай, але фанабэрлівай і легкадумнай яблыневай галінкі і інш.);

• вучыць характарызаваць герояў паводле іх паводзін і разважанняў;

• спрыяць спасціжэнню вучнямі мастацкай ідэі твора, маральнай высновы казкі, яе гуманістычнага пафасу, пазіцыі аўтара (без ужывання дэфініцыі паняцця) і спосабаў яе выяўлення (ацэнка падзей і саміх герояў, іх паводзін і перакананняў, клопатаў і перажыванняў);

• развіваць уменне пяцікласнікаў дзяліць твор на сэнсавыя часткі і падбіраць ім назвы, складаць план, рыхтаваць пераказ.

## IV. Прыроды вечная краса

*(5 гадзін)*

***<u>Тэма 10.</u> Янка Купала.* «Дуб»; *Пімен Панчанка.* «Красавіцкая навальніца»; *Хведар Жычка.*» За ягадным лесам»; *Янка Сіпакоў.* «Чым пахне дождж» (урывак з рамана «Даверлівая зямля»); *Еўдакія Лось.* «Мінулагодні ліст»; *Вера Вярба.* «Схіляецца ніва да самай зямлі…»; *Кузьма Чорны.* «На схіле восені»**

Майстэрства пісьменнікаў у перадачы колеравай і гукавой гамы навакольнага свету. Замілаванне, захапленне аўтараў роднымі краявідамі, прыгажосцю беларускай зямлі. Тонкасць паэтычнага светаад-

чування. Адухоўленасць карцін прыроды. Эмацыянальная пранікнёнасць, цеплыня, задушэўнасць выказвання, даверлівасць інтанацыі. Вобразнасць, выразнасць і пластычнасць мовы твораў.

Аналіз рэпрадукцый пейзажных палотнаў беларускіх мастакоў (Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Эдуарда Рымаровіча, Уладзіміра Сулкоўскага, Міколы Купавы, Уладзіміра Савіча і інш.). Параўнальны аналіз пейзажа ў літаратурным творы і ў творы жывапісу. Вуснае калектыўнае сачыненне па карціне.

Вуснае сачыненне з элементамі апісання і разважання на адну з тэм: «Мой родны кут, як ты мне мілы!», «Мой чароўны беларускі край…» і да т. п.

*Мэты і задачы:*

• выклікаць у вучняў пачуццё захаплення прыгажосцю і гармоніяй карцін прыроды, дапамагчы адчуць іх суладнасць са станам душы, пачуццямі і перажываннямі аўтараў;

• развіваць эмацыянальную чуйнасць, вобразнае ўяўленне вучняў пры ўспрыманні мастацкага апісання карцін прыроды, удасканальваць уменні вучняў узнаўляць карціны прыроды, вызначаць настраёвасць, танальнасць твораў, выяўляць аўтарскія пачуцці і перажыванні, перададзеныя праз адметную форму, вобразы, мастацкія тропы, паэтычны сінтаксіс, іншыя сродкі мастацкага выяўлення;

• паглыбіць веды вучняў пра мастацкі вобраз ў паэтычным творы, ролю вершаванага памеру, рытму, рыфмы, гукапісу, моўных выяўленчых сродкаў у яго стварэнні, пра спосабы выяўлення аўтарскага пачуцця ў вершах;

• вучыць супастаўляць пейзажныя творы розных аўтараў;

• удасканальваць уменні пяцікласнікаў аналізаваць пейзаж у літаратурным тэксце і творы жывапісу, супастаўляць мастацкі і літаратурны пейзажы, блізкія па тэматыцы (асноўныя вобразы, перадача аўтарскага настрою сродкамі мастацкага выяўлення ў розных відах мастацтва — жывапісе і літаратуры);

• вучыць рыхтаваць вуснае сачыненне па карціне.

## V. Жыццёвымі сцежкамі
*(6 гадзін)*

### ***Тэма 11.*** ***Вячаслаў Адамчык.*** **«Сонечны зайчык».** *(2 гадзіны)*

Рэальна-жыццёвая аснова апавядання. Гісторыя кошкі, яе значэнне ў раскрыцці ідэі твора. Драматызм і напружанасць сюжэта. Гуманістычны пафас твора. Ідэя дабрыні і міласэрнасці да прыроды. Псіхалагізм у раскрыцці вобразаў. Асоба аўтара-апавядальніка ў творы.

Калектыўнае вуснае сачыненне-аповед.

*Мэты і задачы:*

• дапамагчы вучням вызначыць і прааналізаваць ключавыя эпізоды твора;

• развіваць уменні супастаўляць паводзіны і ўчынкі герояў, аналізаваць іх жыццёвыя пазіцыі, звяртаючы ўвагу на псіхалагічную матывіроўку паводзін;

• спрыяць спасціжэнню галоўнай ідэі, гуманістычнага пафасу твора;

• пашырыць уяўленні вучняў пра свет прыроды, яго непаўторнасць, багацце, шматфарбнасць;

• выхоўваць любоў і беражлівыя адносіны да братоў нашых меншых.

### ***<u>Тэма 12.</u> Янка Маўр.*** **«Шчасце».** *(1 гадзіна)*

Рэальна-жыццёвая аснова апавядання. Вобраз хлопчыка, яго адкрытасць, наіўнасць, даверлівасць. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы душэўнага стану героя. Мяккі лірызм аповеда. Пейзаж у творы. Асоба аўтара-апавядальніка, яго стаўленне да героя.

Творчы пераказ (з развражаннем пра магчымы далейшы лёс героя).

*Мэты і задачы:*

• прааналізаваць асноўны эпізод апавядання, падсумаваць назіранні вучняў за паводзінамі герояў, звяртаючы ўвагу на раскрыццё душэўнага стану хлопчыка і псіхалагічнае адчуванне апавядальніка;

• дапамагчы пяцікласнікам спасцігнуць асноўную думку твора, зразумець пазіцыю аўтара (цеплыню, сімпатыю, спачуванне, прыхільнасць, лёгкі гумар) у паказе сялянскага хлопчыка;

• прапанаваць вучням паразважаць над магчымым далейшым лёсам героя, улічваючы яго тонкую душэўную арганізацыю, паводзіны ў канкрэтнай жыццёвай сітуацыі.

### ***<u>Тэма 13.</u> Янка Брыль.*** **«Маці».** *(2 гадзіны)*

Трагічнае гучанне твора. Кантраснасць і эмацыянальная сугучнасць карцін прыроды і стану душы маці. Вобразы маці і яе сына Сцяпана і сродкі стварэння іх характараў (апісанне знешняга выгляду персанажаў, іх паводзіны і перажыванні, стасункі паміж сабой). Драматызм, напружанасць сюжэта. Роля заключнага эпізоду ў раскрыцці тэмы. Пейзаж у апавяданні. Асоба аўтара-апавядальніка ў творы.

Разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя.

*Мэты і задачы:*

• псіхалагічна падрыхтаваць вучняў да ўспрымання мастацкага твора, дзе гераічнае паўстае ў непарыўнай сувязі з трагічным;

• арганізаваць першаснае ўспрыманне твора (сам настаўнік чытае тэкст цалкам);

• дапамагчы прааналізаваць асноўныя эпізоды, у якіх раскрываецца характар маці, прасачыць, як простая сялянская жанчына становіцца сапраўдным героем;

• дапамагчы зразумець ролю мастацкай дэталі ў раскрыцці ідэйна-мастацкага зместу твора;

• замацаваць і паглыбіць веды вучняў пра літаратурнага героя і спосабы яго паказу ў празаічным творы (думкі, перажыванні, учынкі, партрэт, мова, пейзаж, інтэр'ер, адносіны аўтара і інш.).

## VI. Прыгоды
*(2 гадзіны)*

### <u>*Тэма 14.*</u> ***Міхась Лынькоў.*** **«Прыгоды Міколкі з дзедам Астапам» (урывак з аповесці «Міколка-паравоз»)**

Прыгодніцкі характар твора. Займальнасць сюжэта. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы характараў Міколкі і дзеда Астапа. Раскрыццё характараў герояў праз дыялогі. Роля гумарыстычных элементаў у выяўленні аўтарскіх адносін да герояў.

Выразнае чытанне дыялогаў па асобах, ілюстраванне ці інсцэніроўка аднаго з эпізодаў твора.

*Мэты і задачы:*

• пазнаёміць вучняў са зместам твора, дапамагчы вызначыць ключавыя эпізоды, асэнсаваць этапы развіцця дзеяння, акрэсліць ланцужок падзей;

• спрыяць назапашванню матэрыялу, неабходнага для характарыстыкі Міколкі і дзеда Астапа;

• вучыць пяцікласнікаў заўважаць лёгкі аўтарскі гумар у перадачы падзей і абмалёўцы герояў, паглыбіць веды пра гумар і сродкі яго выяўлення ў мастацкім творы;

• удасканальваць уменне вучняў выразна чытаць празаічны тэкст займальнага зместу, перадаваць стоены аўтарскі гумар, добразычлівае стаўленне пісьменніка да сваіх герояў;

• дапамагчы інсцэніраваць адзін з эпізодаў твора (вызначыць асобныя дыялогі і скампанаваць іх, каб атрымалася кароценькая пастаноўка, адабраць выканаўцаў, прадумаць іх позы, жэсты, міміку і інш).

***Заключны ўрок.* Конкурс на лепшага чытальніка.** *(1 гадзіна)*

Арганізацыя і правядзенне конкурсу па выразным чытанні верша ці ўрыўка прозы. Падвядзенне вынікаў навучальнага года.

# МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ

## І. Роднае слова

*(Асновы выразнага чытання)*

***Беларуская мова — нацыянальнае духоўнае багацце народа***

У працэсе літаратурнага навучання (пачынаючы з пятага класа) рэалізуецца ўспрыманне школьнікамі мовы як асновы духоўнай дзейнасці людзей, галоўнага сродку зносін, прыводзяцца ў сістэму іх веды аб літаратурных нормах, выпрацоўваюцца і развіваюцца ўменні эмацыянальна адгукацца на творы мастацтва, узнаўляць абмаляваныя пісьменнікам карціны і вобразы і аналізаваць іх, выразна чытаць творы розных жанраў, выяўляючы аўтарскія пачуцці і свае адносіны да літаратурных герояў, лагічна выказваць свае думкі.

На першых факультатыўных занятках настаўнік звернецца да пяцікласнікаў з уступным словам пра тое, што беларуская мова з'яўляецца нацыянальным духоўным багаццем народа. Яна самабытная і арыгінальная, надзвычай прыгожая, мілагучная, вобразная, выразная. Настаўнік адзначыць, што кожны цывілізаваны народ шануе сваю мову, лічыць яе сваім неацэнным духоўным набыткам, падкрэсліць, што родная мова павінна адыгрываць выключную ролю ў жыцці грамадства.

Высакародную традыцыю ўслаўлення сваёй мовы — найвялікшага духоўнага скарбу — маюць і беларусы. Шчырыя і пранікнёныя словы прысвячаюць сваёй мове беларускія пісьменнікі розных пакаленняў. У вершах і прозе яны пяшчотна называюць нашу мову «роднай», «матчынай», выказваюць сваю любоў да беларускага слова, замілаванасць і захапленне ім: «Магутнае слова, ты, роднае слова!» (*Янка Купала*); «Жывое ў вяках беларускае слова — народа душа і народа хвала» (*Алесь Бачыла*); «Мова, пявучая родная мова, ты ўладарка нявызнаных скарбаў» (*Аляксей Зарыцкі*); «Слова! Цуд найвялікшы між цудаў-дзівосаў» (*Ніл Гілевіч*).

Варта таксама нагадаць пяцікласнікам пра тое, што нашы продкі пакінулі багацейшую духоўную спадчыну — вусную народную творчасць. Беларускія народныя міфы, казкі, легенды, прыкметы і павер'і праз стагоддзі перадаюць нам мудрасць, веды, вопыт, традыцыі нашых прашчураў. Сіла і краса народнага мастацтва надзвычай яскрава адлюстравана ў народных песнях, загадках, прыказках.

З далёкіх часоў беларуская мова нястомна служыць народу. Бліскучыя ўзоры ўжывання слова сведчаць пра жыццёвы досвед, мудрасць і добры густ нашых продкаў. Слова — найдаражэйшы чалавечы скарб. Сваё разуменне надзвычайнай ролі слова ў грамадстве нашы прашчуры ўвасобілі ў прыказках: «На агні не гарыць, у вадзе не тоне», «Куляй пацэліш у аднаго, а трапным словам у тысячу», «Крылаў не маю, а хутка лятаю, сам мяне выпусціш, ды потым не зловіш», «Добрае слова не забываецца», «Добрае слова далёка чуваць», «Ласкавае слова, як сонейка, грэе», «Слова даражэй за золата» і інш.

Роднае слова — гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём свет. Яно дае нам магчымасць авалодваць ведамі, вывучаць сваю гісторыю, пераймаць вопыт іншых людзей, разумець адно аднаго, дзяліцца сваімі думкамі, атрымліваць асалоду ад чытання мастацкай літаратуры, праз кнігі пазнаваць людзей і само жыццё. Неабходна шанаваць і старанна вывучаць родную мову. Кожны адукаваны чалавек павінен умець проста, зразумела і дакладна перадаваць свае думкі вусна і пісьмова. А гэта магчыма толькі тады, калі мы будзем ведаць, як правільна вымаўляць і пісаць словы, як выразна чытаць і як трэба будаваць сказы, каб афарміць свае думкі правільна і даходліва. Свабоднае валоданне роднай мовай дае таксама магчымасць спасцігнуць багацце нашай старадаўняй нацыянальнай культуры.

Пасля кароткага ўступнага слова сам настаўнік выразна прачытае верш Якуба Коласа «Слова — радасць, слова — чары...», пазначаны ў праграме факультатыва, каб ён увасобіўся ў гучанні меладычна і лагічна, — толькі ў гэтым выпадку можна разлічваць на максімальнае ўздзеянне на вучняў. Слова жыве ў гуках голасу, у гэтым яго прырода. Задача настаўніка — данесці да слухачоў мастацкую сутнасць твора, правільна перадаць яго тон, пафас, эмацыянальную афарбоўку і наладзіць на занятках калектыўнае абмеркаванне верша. Можна скарыстаць, напрыклад, такія пытанні:

• Што значыць беларускае слова для паэта?

• Якія вобразы перадаюць захапленне аўтара роднай мовай? Які з гэтых вобразаў падаўся вам найбольш выразным, паэтычным?

• Як вы ставіцеся да беларускай мовы? Ці сугучнае ваша ўспрыманне роднай мовы пачуццям аўтара? Выкажыце свае адносіны.

• Якія свае ўласныя пачуцці вы хацелі б перадаць пры чытанні гэтага верша?

Настаўнік арганізуе калектыўнае чытанне артыкула пра выразнае чытанне вершаў у дапаможніку для факультатыва «Браму скарбаў сваіх адчыняю…», адрасаваным вучням. Пяцікласнікі з дапамогай настаўніка ўсвядомяць, што *выразнасць чытання — гэта вобразная перадача чытачом тэксту ў адпаведнасці з задумай пісьменніка.*

Настаўнік падвядзе пяцікласнікаў да высновы, што выразнае чытанне твора дапамагае ўспрыняць яго цэласна, з усімі мастацкімі па-

драбязнасцямі і адценнямі, ва ўсёй прыгажосці і глыбіні. Чытальніку неабходна перадаць голасам лагічную і сінтаксічную мелодыку мовы, музыку і рытм верша, строй вершаванай і празаічнай мовы. Такое майстэрства дасягаецца навучаннем і вялікай працай, яно патрабуе адпаведных здольнасцей. У пэўнай ступені выразнаму чытанню можа навучыцца кожны старанны чалавек, асабліва калі найперш прааналізуе яго, паразважае над вобразамі, аўтарскімі думкамі і перажываннямі. А потым пры ўласным чытанні ўголас пастараецца перадаць свае пачуцці, прачытаць яго ў патрэбным тэмпе, з адпаведнай інтанацыяй, перадаючы слухачам сваё разуменне.

Няхай вучні задумаюцца над пытаннямі:

• Якое чытанне называюць выразным?

• Для чаго неабходна вучыцца выразнаму чытанню?

• Што патрэбна для навучання выразнаму чытанню вершаў?

• Як асабіста вы збіраецеся навучыцца чытаць выразна?

У гутарцы з вучнямі настаўнік высветліць, што значыць прачытаць верш выразна. Шляхам калектыўнага абмеркавання вучні (з дапамогай настаўніка) прыйдуць да высновы, што прачытаць верш выразна — значыць, захоўваючы нормы літаратурнага вымаўлення:

• перадаць настрой, якім прасякнуты твор;

• раскрыць характэрныя асаблівасці з’яў і карцін, адлюстраваных у вершы;

• без скажэння перадаць аўтарскія думкі і перажыванні;

• з найбольшай выразнасцю выказаць свае ўражанні, сваё разуменне твора.

Каб удасканаліць чытальніцкае майстэрства, вучню неабходна авалодаць тэхнікай выразнага чытання — выпрацаваць фанацыйнае дыханне, правільнае вымаўленне, дасканалую дыкцыю, валоданне сваім голасам, а таксама набыць уменні па прадмеце — эмацыянальна адгукацца на твор мастацтва слова, узнаўляць малюнкі і карціны, створаныя пісьменнікам, разумець пачуцці герояў і суперажываць ім, арыентавацца ў сістэме вобразаў, спасцігаць аўтарскую пазіцыю, правільна вызначаць мэту чытання, каб перадаць неабходныя думкі і пачуцці і дапамагчы слухачам зразумець твор мастацтва.

Настаўнік зазначыць, што выразнае чытанне — гэта свайго роду мастацтва, пэўнае майстэрства, якім пры жаданні можна авалодаць. Навучанне выразнаму чытанню пачынаецца з практыкаванняў у дакладным вымаўленні гукаў, слоў, сказаў, выпрацоўцы ўмення правільна інтанаваць сваё чытанне ці выказванне. Майстэрства выразнага чытання і маўлення, як і ўсякае іншае, прыходзіць з працай, стараннем, вопытам.

Будзе дарэчы прапанаваць пяцікласнікам прыгадаць ужо знаёмы ім твор, калі група слаба падрыхтавана (напрыклад, верш «Мова» *Яўгеніі Янішчыц*, які разглядаўся на ўроку), каб яшчэ папрацаваць

над ім дома і потым выразна прачытаць яго на занятках. Калі вучні падрыхтаваны лепш, хай яны дома самастойна пазнаёмяцца з вершам Анатоля Грачанікава «Мова» і падрыхтуюць яго выразнае чытанне. Дарэчы было б, каб яны дома запісалі сваё чытанне на магнітафон і праслухалі запісы, а потым прааналізавалі сваё выканальніцкае майстэрства і зрабілі адпаведныя высновы, каб прачытаць твор на занятках ужо з улікам выпраўленых недахопаў. Можна параіць пяцікласнікам скарыстаць у падрыхтоўцы гэтага задання дапамогу і парады бацькоў ці старэйшых дзяцей.

Каб скарэкціраваць далейшую працу па выразным чытанні, на наступных занятках настаўнік наладзіць праслухоўванне вучнёўскага чытання падрыхтаванага дома верша, калектыўнае добразычлівае яго абмеркаванне і падвядзенне вынікаў. Калі школьнікі па чарзе (паколькі група невялікая) будуць чытаць адзін тэкст, аналіз пройдзе больш жыва і арганізавана. Праслухоўванне закончыцца тактоўным абагульненнем настаўніка, які адзначыць вартасці вучнёўскага чытання і найбольш характэрныя недахопы (гэта могуць быць эмацыянальная глухата, паспешлівасць чытання, невыразная дыкцыя, інтанацыйная невыразнасць або штучная пафаснасць і інш.). Задача настаўніка — узнавіць і сістэматызаваць веды пяцікласнікаў пра культуру маўлення, папярэдне атрыманыя на ўроках беларускай мовы і літаратуры, падвесці вучняў да высновы, што ў мастацтве выразнага чытання няма дробязей. Немагчыма выразна прачытаць твор, перадаць аўтарскае бачанне і свае адносіны, да канца не асэнсаваўшы тэкст, свободна не валодаючы сваім голасам, без навыкаў дакладна і правільна вымаўляць гукі, словы, сказы.

Настаўнік падвядзе вучняў да высновы, што *слухачам* выразнае чытанне дапамагае зразумець верш ва ўсёй прыгажосці і глыбіні, з усімі мастацкімі падрабязнасцямі і адценнямі, аднак ад *чытальніка* патрабуюцца жаданне, здольнасці і вялікая праца. Перш чым паспрабаваць выразна прачытаць твор, неабходна спачатку яго прааналізаваць, паразважаць над ім, спасцігнуць вобразы, зразумець аўтарскія думкі і перажыванні і ўжо потым пастарацца прачытаць у патрэбным тэмпе, перадаць сілай і афарбоўкай голасу сваё разуменне тэксту, праз адпаведную інтанацыю выказаць свае пачуцці. Выразнае чытанне развівае ўяўленне, паглыбляе эмоцыі, абвастрае ўспрыманне, павышае маўленчую культуру, дазваляе перажыць радасць творчасці.

На наступных занятках настаўнік засяродзіць увагу вучняў на чытанні і аналізе твораў патрыятычнага гучання, прысвечаных ўслаўленню беларускай мовы, апяванню роднага краю (вершы *Пятруся Броўкі* «Багата, родная ты мова...», *Пімена Панчанкі* «Родная мова», *Анатоля Грачанікава* «Мова...», *Ніла Гілевіча* «Тут, між гэтых пагоркаў, у гэтых барах і дубровах...»). Гэтыя творы розняцца пафасам, настраёвасцю, лексікай, мелодыкай, будовай, але ў іх з глыбокай пяшчотай выказаны

любоў паэтаў да сваёй мовы, захапленне яе прыгажосцю, мілагучнасцю, непаўторнасцю. Разам з тым выказваецца заклапочанасць яе лёсам, просьба-патрабаванне шанаваць багацейшыя моўныя скарбы.

Падчас разгляду верша Петруся Броўкі «Багата, родная ты мова...» пасля высвятлення агульнага настрою твора і першаснага ўражання пяцікласнікаў варта звярнуць іх увагу на значэнне слова *вобраз* у тэксце:

*Радок сухі — без лісцяў голле,*
*А вобраз аздабляе шмат.*
*Ах, каб збіралася іх болей,*
*Ды каб усе на добры лад!*

У вершы надзвычай многа параўнанняў, і тут будзе дарэчы падрабязна іх разгледзець, звярнуўшы ўвагу вучняў на арыгінальныя вобразы, створаныя пры дапамозе параўнанняў: *вятры — вандроўнікі; барозны — гуслі на раллі; сосны — рыцары ў шаломах; крыніцы — вочы ўсёй зямлі; хвалі ўвосень — гэта зрэб'е; як срэбра, ручаёк цячэ; зоры — як цвікі на небе; дзяўчыну лічым мы бярозкай; завём старога пнём сівым; быццам човен, — светлы месяц; воблака плыве, як рыба; так падобен хлеб да скібы тае зямлі, дзе ён узрос*.

Аналіз верша можа ісці прыкладна па такіх пытаннях:

• Як ставіцца паэт да роднай мовы? Якім чынам выяўляе ён свае пачуцці?

• Якія яскравыя доказы непаўторнага хараства і багацця беларускай мовы прыводзіць аўтар у сваім вершы?

• Якую ролю, на яго думку, адыгрываюць мастацкія вобразы ў нашай мове? Як пра гэта гаворыцца ў вершы? Адшукайце і зачытайце адпаведныя радкі.

• Як удзельнічаюць у стварэнні вобразаў верша параўнанні? Прыгадайце канкрэтныя прыклады і пракаменціруйце іх.

• Якія з параўнанняў вам падаліся найбольш трапнымі, а вобразы — надзвычай цікавымі і арыгінальнымі? Чым яны вас уразілі?

У вершы Пімена Панчанкі «Родная мова» ўжо ў першых радках выказаны аўтарскі боль за лёс беларускай мовы ў нашым грамадстве (дарэчы, верш створаны ў 1962 годзе, аднак, на жаль, і сёння ён не страціў сваёй актуальнасці і гучыць надзённа), сцвярджаецца, што родная мова — неацэннае багацце, найвышэйшая каштоўнасць для паэта. Варта прадоўжыць назіранне за роляй тропаў (найперш эпітэтаў і параўнанняў) у стварэнні вобраза мовы: *вечна жывая, як раса, як сляза, як зара; гэта — ластавак шчабятанне, звон світальны палескіх крыніц, сінь чабору, і барвы зарніц, і буслінае клекатанне*.

Падчас разгляду верша немагчыма абмінуць увагай і надзвычай дасканалае паэтычнае апісанне-характарыстыку месяцаў, і кожны з іх — надзвычай дасканалы і непаўторны мастацкі вобраз:

*Студзень — з казкамі снежных аблокаў,*
*Люты — шчодры на сіні мароз,*
*Сакавік — з сакатаннем і сокам*
*Непаўторных вясновых бяроз,*
*Красавік — час маланак і ліўняў,*
*Травень — з першым каханнем, сяўбой,*
*Чэрвень — з ягаднаю зарой,*
*Ліпень — з мёдам,*
*З пшаніцаю — жнівень,*
*Светлы кастрычнік*
*У празрыстасці чыстай, крынічнай,*
*Лістапад — залаты лістапад,*
*Снежань — першы густы снегапад...*

Аналіз верша можна наладзіць прыкладна па такіх пытаннях:

• З чым параўноўвае сваю мову паэт? Знайдзіце ў вершы гэтыя параўнанні, растлумачце іх сэнс.

• Якія карціны ўзнікаюць ва ўяўленні паэта, калі ён згадвае надзвычай паэтычныя і мілагучныя назвы месяцаў? Зачытайце іх.

• Як вы думаеце, ці выпадкова ў радках *Толькі месяцаў назвы пакіньце, / Назвы* ***родныя роднай*** *зямлі* аўтар паставіў побач аднакарэнныя прыметнікі? Чым, на вашу думку, гэта выклікана?

• Што надзвычай хвалюе паэта? Якія думкі і пачуцці ўстрывожылі яго, прымусілі ўзяцца за пяро? Паразважайце, якімі жыццёвымі абставінамі магло быць выклікана стварэнне гэтага верша?

• Якія пачуцці і перажыванні аўтар хацеў выказаць сваім вершам:

а) боль, клопат за лёс роднай мовы;

б) гонар за сваю мову;

в) захапленне яе багаццем, змястоўнасцю, меладычнасцю;

г) удзячнасць лёсу, што мае такую прыгожую і выразную мову;

д) перакананасць, што беларуская мова для яго найдаражэйшая ў свеце і застанецца такой назаўсёды?

• Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша. Пастарайцеся пры чытанні перадаць настраёвасць верша, пачуцці самога аўтара. Паразважайце, якая інтанацыя — разважлівая, спакойная, даверлівая, усхваляваная або ўрачыстая, узнёслая — лепш прыдатная для перадачы перажыванняў паэта.

У такім жа рэчышчы могуць аналізавацца і вершы Анатоля Грачанікава і Ніла Гілевіча. Можна скарыстаць пытанні і заданні, змешчаныя да гэтых твораў у дыдактычным дапаможніку для вучняў «Браму скарб сваіх адчыняю…». Асноўная ўвага дзяцей будзе засяроджана на выяўленні настраёвасці вершаў, аўтарскім перажыванні і спосабах яго выяўлення, на вобразным ладзе вершаў, вучнёўскім успрыманні.

Каб падвесці вынікі па ўсім раздзеле, можна скарыстаць прыкладна такія пытанні і заданні:

• Пазнаёміўшыся з творамі гэтага раздзела дапаможніка, вы пераканаліся, што кожны паэт па-свойму выяўляе любоў да роднай мовы. Што яднае гэтыя вершы (звярніце ўвагу на змест, агульны настрой, выказаныя пачуцці)? Чым творы адрозніваюцца (скіруйце ўвагу на арыгінальнасць вобразаў і багацце сродкаў іх стварэння, на іх мелодыку, інтанацыю, будову)?

• Якія паэтычныя вобразы вам найбольш спадабаліся? Растлумачце свой выбар.

• Чым, на вашу думку, з'яўляецца родная мова для кожнага чалавека, для народа ў цэлым? Ці можа існаваць народ без сваёй мовы?

• А як асабіста вы ставіцеся да беларускай мовы? Падрыхтуйце вусную замалёўку на адну з тэм: «Багата, родная ты мова…», «Мова, пявучая родная мова...» — ці падбярыце іншую назву свайму выказванню. Карыстайцеся паэтычнымі вобразамі, якія вас найбольш усхвалявалі, былі сугучнымі вашым пачуццям і думкам. Падбярыце ілюстрацыі да сваёй замалёўкі, скарыстаўшы рэпрадукцыі карцін вядомых мастакоў ці фотаальбомы з беларускімі краявідамі.

• Абагульніце свае разважанні і атрыманыя ад вершаў уражанні і падрыхтуйце калектыўнае вуснае сачыненне пра беларускую мову.

## II. Вывучэнне фальклорных твораў
*(Асновы культуры маўлення)*

На занятках, прысвечаных вуснай народнай творчасці, настаўнік распачне гаворку пра тое, што за доўгія стагоддзі сваёй гісторыі беларускі народ стварыў багацейшую духоўную спадчыну — мноства міфаў, легенд, казак, песень, загадак, прыказак, прыкмет і павер'яў. Фальклорныя творы ўвабралі ў сябе веды і вопыт многіх пакаленняў беларусаў, іх мары і спадзяванні. З гэтай прычыны вусную народную творчасць лічаць паэтычнай гісторыяй народа. Аднак фальклор — яшчэ і з'ява мастацтва, дзе ўсё багацце ідэй выяўляецца праз мастацкія вобразы. Вусная паэтычная творчасць надзвычай добра захавалася не толькі ў памяці, але і ў актыўным ужытку беларусаў. Глыбіня зместу, дасканаласць мастацкай формы фальклорных твораў і сёння жывяць фантазію і натхняюць многіх пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, якія ў сваёй творчасці захоўваюць нацыянальныя традыцыі, выкарыстоўваюць тэмы і вобразы народнай паэзіі.

Далей гаворка пойдзе пра фальклорныя творы малых жанраў — прыказкі, загадкі, прыкметы. Настаўнік зазначыць, што вусная народная творчасць — скарбонка духоўнай сілы народа. У фальклорных творах адлюстраваны багаты працоўны і жыццёвы вопыт нашых продкаў, іх быт, мараль, псіхалогія, культура, ідэалы, пачуццё пры-

гожага. Сярод іншых фальклорных жанраў *прыказкі* вылучаюцца дасканаласцю і лаканізмам формы, афарыстычнасцю і вобразнасцю мовы, абагульняльным і павучальным зместам. Асноўным крытэрыем чалавечай годнасці ў беларускіх прыказках з'яўляецца стаўленне чалавека да працы. У іх ухваляюцца гаспадарлівасць, умельства, кемлівасць, дасціпнасць, гасціннасць і іншыя станоўчыя чалавечыя якасці, высмейваюцца гультайства, дармаедства, ашуканства, хцівасць і іншыя заганныя рысы. Прыказкі надзвычай паэтычныя, адрозніваюцца багатым асацыятыўным зместам. Гэта не толькі спадчына мінулага, але і жывая паэзія народа ў сучаснасці. Прыказкі карыстаюцца ў беларусаў найбольшай папулярнасцю. Яны надзвычай шырока ўжываюцца ў штодзённым жыцці чалавека, святочных народных абрадах, у мастацкай літаратуры.

Старадаўнія людзі цудоўна ведалі ўладу слова, адчувалі яго прыгажосць, непаўторнасць, глыбіню. Яны пакінулі нам выдатныя ўзоры вобразных і трапных характарыстык прыродных з'яў, прадметаў, рэчаў. Нашы продкі адухаўлялі прыроду, надзялялі яе чалавечымі якасцямі — уменнем думаць, адчуваць, дзейнічаць. Імкненне ўздзейнічаць на прыроду хітрым словам, утаіць ад яе свае намеры і выклікала ў людзей патрэбу ў стварэнні ўмоўнай мовы. Так з'явіліся вобразныя апісанні ўтоенага, зашыфраванага прадмета ці з'явы — *загадкі*, якія патрабавалі разгадак. У загадках вядомая людзям рэч паўстае ў нечаканым, незвычайным вобразе. Загадкі будуюцца на аснове параўнання, супастаўлення з'яў і прадметаў.

*Прыкметы і павер'і* па форме набліжаюцца да загадак і прыказак. У іх абагульнены багаты працоўны вопыт народа. Прыкметы былі чалавеку штодзённымі дарадцамі, падказвалі, як паводзіць сябе ў пэўных жыццёвых сітуацыях, засцерагалі ад неабачлівых паводзін, забаранялі некаторыя дзеянні. Няўменнем нашых продкаў вытлумачыць асобныя прыродныя з'явы або жыццёвыя здарэнні абумоўлена з'яўленне некаторых павер'яў, дзе трактаваўся невядомы факт, грунтуючыся на выдумцы, чалавечай фантазіі, часам нават на містыцы.

Пасля гутаркі пра мастацкія адметнасці малых фальклорных жанраў аналізуюцца прыказкі, вызначаюцца магчымыя жыццёвыя сітуацыі, у якіх прыдаліся б азначаныя прыказкі, адгадваюцца загадкі. Дарэчы будзе прапанаваць вучням усім разам скласці некалькі загадак і падрыхтаваць калектыўнае вуснае сачыненне з элементамі апісання па адной з абраных прыказак.

Фальклорныя творы малых жанраў — надзвычай зручны матэрыял для практыкавання вучняў у выразным чытанні. Пяцікласнікі ведаюць, што кожны чалавек мае свой адметны голас, які адрозніваецца сілаю, тэмбрам, вышынёю, дыяпазонам і інш. У людзей розная дыкцыя, свой тэмп маўлення. Мілагучны, прыемны, добра пастаўлены голас чытача або прамоўцы дапамагае слухачам адэкватна ўспрымаць

пачутае. Не апошнюю ролю адыгрываюць правільнае вымаўленне чытальніка, веданне ім арфаэпічных правіл.

Развіццё ў пяцікласнікаў умення выразна чытаць мастацкія творы на факультатыўных занятках пачынаецца з тэхнікі маўлення — прыцягнення ўвагі вучняў да якасці вымаўлення гукаў, слоў, сказа або вершаванай страфы. Пачынаць працу варта з найбольш простага — з вымаўлення гукаў, гэта будзе карысна не толькі для правільнага напісання (арфаграфіі), але і для патрэб выразнага маўлення, для дыкцыі. Для гэтага найлепш прыдадуцца скорагаворкі: яны пабудаваны на спалучэнні гукаў, якія робяць цяжкім іх прачытанне. Скорагаворкі маюць забаўляльны сэнс і прызначаны менавіта для практыкавання ў правільным вымаўленні:

Пасярод двара — гара,
На вяршэчку — сані.
А хто што дастане —
Гаварыце самі.
Сонечка — саначкі.
Верачка — вяровачку,
А малы Іваначка —
Скорагаворачку. (*Васіль Вітка*)

Многа клопату мы мелі,
Млын паставілі на мелі. (*Сяргей Грахоўскі*)

Тэхніка выразнага чытання і маўлення прадугледжвае найперш навучанне школьнікаў правільнаму *маўленчаму дыханню*. Дыханне дапамагае вымаўляць гукі мовы: паветра падчас выдыху, сустракаючы на сваім шляху перашкоды, утвораныя моўнымі органамі, нараджае гук. Патрэніраваўшыся ў вымаўленні асобных гукаў, складоў, варта паступова перайсці да вымаўлення асобных слоў, словазлучэнняў, цэлых сказаў. Для гэтага можна скарыстаць прыказкі, загадкі, вершаваныя радкі. Вучні на канкрэтных прыкладах пераканаюцца, што вымаўленыя на адным выдыху моўныя фрагменты (фраземы) могуць быць, у залежнасці ад спецыфікі тэксту, кароткія і больш працяглыя. Чым даўжэйшая фразема, тым больш паветра неабходна на яе вымаўленне, таму чытальнік павінен добра валодаць сваім фанацыйным дыханнем. Ад гэтага залежыць якасць чытання. Звычайна кожны ўдых суправаджаецца паўзай. Вучню неабходна так размеркаваць дыханне, каб яго было дастаткова для вымаўлення цэлай фраземы. Практыкаванні ў вымаўленні словазлучэнняў і цэлых сказаў будуць садзейнічаць выпрацоўцы правільнага дыхання ў школьнікаў.

Разнастайныя эмоцыі, якія надаюць інтанацыйную выразнасць нашаму голасу, выклікаюцца найперш зместам тэксту, асноўнай думкай, выказанай у ім. Выпрацоўваючы навыкі інтанавання знакаў прыпынку, вучні ўзгадваюць асноўныя сродкі лагічнай выразнасці — націск і паўзу, ад выкарыстання якіх залежыць раскрыццё сэнсу мастацка-

га тэксту. Далейшыя высілкі пяцікласнікаў варта сканцэнтраваць на падрыхтоўцы партытуры для выразнага чытання прыказак і загадак. Настаўнік дапаможа вучням наладзіць калектыўную працу — вызначыць сэнсавыя часткі, разбіць фразы на маўленчыя такты, расставіць лагічныя націскі і паўзы, графічна абазначыць элементы выразнага чытання, вызначыць інтанацыю, каб выразна прачытаць прапанаваныя выслоўі.

Падрыхтоўка да выразнага чытання твора пачынаецца з вызначэння ў сказе лагічнага націску і расстаноўкі лагічных паўз. Для практычнай работы (складання партытуры чытання) варта выкарыстаць розныя па форме і зместу прыказкі і загадкі. На канкрэтных прыкладах настаўнік пакажа, што вызначэнне лагічных націскаў (націскных слоў, сэнсавых акцэнтаў) пры чытанні ў кожным канкрэтным выпадку залежыць ад таго, як разумее тэкст чытальнік. У факультатыўнай групе сярод вучняў можа ўзнікнуць некалькі варыянтаў пастаноўкі лагічных націскаў, і настаўнік, заахвочваючы дыскусію, прапануе вучням выказаць сваё разуменне і абгрунтаваць сваю прапанову.

Пяцікласнікі (з дапамогай выкладчыка) усвядомяць, што выразнасць чытання дасягаецца таксама правільным вызначэннем паўз у тэксце. Паўза — прыпынак у чытанні, працягласць якога залежыць ад зместу фразы і ад успрымання яе чытальнікам. Паўза дапамагае правільна перадаць сэнс мастацкага тэксту, робіць мову больш натуральнай і выразнай. Яна не толькі дзеліць сказ на часткі, але і аб’ядноўвае гэтыя часткі, надаючы сэнсавае адзінства словам, што знаходзяцца паміж паўзамі.

Варта таксама прадэманстраваць асобныя прыклады, дзе паўзы супадаюць са знакамі прыпынку, а дзе (каб падкрэсліць сэнс слова ці словазлучэння або ўзмацніць уздзеянне на слухачоў) іх робяць у іншых месцах сказа, калі знакі прыпынку адсутнічаюць. Настаўнік (з удзелам вучняў) адзначыць і на прыкладах прадэманструе, што кожны знак прыпынку мае сваё гукавое ўвасабленне і выконвае пэўную мастацкую ролю. Гэтыя фігуры — толькі арыенціры ў чытанні, якое найперш залежыць ад суб’ектыўнага разумення твора чытальнікам.

Дзеці ўбачаць, што кожная фраза складаецца з частак, лагічна звязаных сэнсам. Каб зразумець сэнс фразы, яе папярэдне неабходна падзяліць на моўныя такты. Чым сказ карацейшы, тым ён лягчэйшы для разумення пяцікласнікаў, таму пачынаць працу варта з простых прыкладаў. І толькі тады, калі вучні авалодаюць гэтым уменнем, варта ўскладніць заданне — даць для разгляду загадкі, якія складаюцца з некалькіх сказаў, сэнсава звязаных паміж сабой, і прапанаваць вызначаць лагічныя цэнтры (націскныя словы), у якіх заключана аснова думкі аднаго сказа, а потым усёй загадкі.

*Прыказкі:*

**Ранняя** птушка / крылкі цярэбіць, // а **позняя** // вочкі прадзірае.
Глухі / сляпому / **паказвае**, // сляпы / глухому / **расказвае**.
Ніхто не зробіць **горш** табе, // чым **сам** сабе.
Сон **назаўтра** адкладзі, // а справу / **сёння** зрабі.
**Старога** вераб'я /на мякіну //**не падманіш**.
Будзеш **частаваць** / гасцей — // будуць **прыходзіць** / часцей.
Не так будзе, /як **пан** скажа, // а так будзе, / як **мужык** зробіць.
Рыбак / дажджу // **не баіцца**.
Што /**пасееш**, // тое / і **пажнеш**.
І **певень** /на сваім сметніку / гаспадар.
Навучыўся сказаць — // навучыся і **змаўчаць**.

*Загадкі:*

У гародзе летам / цвіце **жоўтым** цветам, // **вышэй** за ўсіх // узняцца б рад, // бо **сонцу** ён / малодшы брат. *(Сланечнік)*

Было **жоўтым**, / вырасла / **зялёным**, // сонца пацалавала, //зноў / **жоўтым** стала. *(Збожжа)*

Стаяць на полі **браточкі**: //белыя **раснічкі**, / залатыя **вочкі**. *(Каласы)*

Каля хаты / ў садочку / між зялёненькіх лісточкаў, //паглядзі, / навідавоку шмат / **красунь** чырванашчокіх. // Хоць **прывабна** пазіраюць, / сэрцы **каменныя** маюць. *(Вішні)*

Наградзе / **агонь** ірдзее, // не пячэцца / і не грэе. // Ён **пахучы** і / **прыгожы**, // нават дождж / заліць не можа. // І з такіх **агнёў-праменняў** // вараць / смачнае **варэнне**. *(Клубніцы)*

Зранку ходзіць / на **чатырох** нагах, // удзень — // на **дзвюх**, // а ўвечары — // на **трох**. *(Чалавек у розным узросце)*

Што / **любіш**, // таго **не купіш**, // а чаго / **не любіш** — // **не прадасі**. *(Маладосць і старасць)*

Некалькі наступных заняткаў настаўнік адвядзе на паглыбленне і сістэматызацыю ведаў пяцікласнікаў пра *народны эпас* беларусаў — буйнейшы набытак нацыянальнай духоўнай культуры, які і сёння захоўвае сваё эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

Асобае месца ў нашай духоўнай спадчыне займаюць народныя *легенды.* Яны нездарма лічацца захавальнікамі гістарычнай памяці народа. Распавядаючы пра гістарычныя падзеі і вядомыя з'явы, легенды часам апісвалі амаль неверагодныя здарэнні, паказвалі незвычайных герояў і іх дзівосныя ўчынкі і прыгоды і разам з тым акрэслівалі пэўныя маральна-этычныя нормы і сацыяльныя ідэалы: добрасумленнае стаўленне чалавека да працы, справядлівыя і добразычлівыя адносіны паміж людзьмі. У легендах амаль заўжды існуе сутыкненне выключных герояў з незвычайнымі варожымі сіламі.

*Казачны эпас* беларусаў вызначаецца надзвычай высокім мастацкім ўзроўнем — багатай вобразнай сістэмай, глыбокім зместам, арыгінальным сюжэтна-тэматычным складам. Сістэма вобразаў у казках будуецца на супрацьпастаўленні. У станоўчых вобразах заўсёды ўвасабляліся народныя ідэалы: казачныя героі надзвычай дужыя, смелыя, разумныя, справядлівыя — абаронцы занядбаных і пакрыўджаных. Вобразы асілкаў, волатаў заўжды з'яўляліся сімвалам непераможнасці народнага духу, жывілі веру чалавека ў лепшае будучае. Беларускія народныя казкі маюць шмат агульных рыс з казкамі іншых народаў свету, у першую чаргу славян. У той жа час, распрацоўваючы агульнавядомыя сюжэты, беларускія казачнікі абапіраліся на нацыянальныя традыцыі, адлюстроўвалі свой быт, навакольны свет, будзённую працу.

Пяцікласнікі ўжо маюць пэўныя веды пра гэтыя жанры, а таксама неабходную для тэарэтычных абагульненняў аснову. Легенды і казкі адпавядаюць цікавасці малодшых падлеткаў да гераічнага, фантастычнага, да ўсяго яркага і незвычайнага. Сюжэты легенд і казак даступныя і зразумелыя пяцікласнікам, яны закранаюць пачуцці дзяцей, здольных фантазіраваць, прыдумляць, перабольшваць, здзіўляцца і захапляцца. У легендах і казках героі падзяляюцца на станоўчых і адмоўных. На шляху адных — жыццёвыя перашкоды і выпрабаванні, якія яны годна пераадольваюць, і дабро перамагае. Другія — прадстаўнікі злых сіл, якія ўсяляк шкодзяць добрым і рыхтуюць усё новыя і новыя выпрабаванні, але ў рэшце рэшт церпяць паражэнне. Школьнікі вучацца разумець народнае ўяўленне пра дабро і зло, пра высокае, сумленнае і агіднае, непрыстойнае. Народны эпас выхоўвае ўсім сваім паэтычным ладам, проста і натуральна, ён абуджае ў пяцікласнікаў фантазію, развівае творчае ўяўленне, фарміруе маральныя арыенціры.

Асноўныя віды працы на занятках — выразнае чытанне па ролях (казкі «Як Сцёпка з панам гаварыў» і «Чаму барсук і лісіца ў норах жывуць»), складанне плана, адказы на пытанні (можна скарыстаць пытанні да твораў, змешчаныя ў дыдактычным дапаможніку для вучняў), пераказ (падрабязны, сціслы, вольны — як запомнілася), складанне чарадзейнай казкі і казкі пра жывёл, інсцэніраванне (прадумаць позы, жэсты, інтанацыі персанажаў, падабраць для іх касцюмы, падрыхтаваць дэкарацыі).

Адным з асноўных відаў працы пры знаёмстве з легендамі і казкамі і дзейсным сродкам узбагачэння і актывізацыі маўленчай культуры пяцікласнікаў з'яўляецца *пераказ*. Яму папярэднічае чытанне, каменціраванне, складанне плана. У аснове пераказу ляжыць узнаўленне асноўных падзей у развіцці сюжэта, указанне месца дзеяння і прадстаўленне яго ўдзельнікаў; выяўленне прычынна-выніковых адносін у тэксце, матывіроўка ўчынкаў герояў; спасціжэнне ідэйнага сэнсу твора (чаму твор атрымаў такую назву, якую пазіцыю займае кожны з персанажаў, хто і што асуджаецца або ўхваляецца). Адказы вучняў су-

праваджаюцца назіраннямі над тэкстам. Ён дзеліцца на кампазіцыйна і лагічна завершаныя часткі, выяўляецца пачатак дзеяння (завязка), развіццё дзеяння і момант найвышэйшага напружання (кульмінацыя) і заключная частка падзей (развязка). Да кожнай часткі падбіраюцца назвы, якія могуць быць планам пераказу. Затым часткі паасобку пераказваюцца вучнем і каменціруюцца настаўнікам. Асабліва цяжкія для пераказу дыялогі, таму неабходна ўважлівае стаўленне да іх. Дарэчы, можна выкарыстоўваць пераказ па асобах — інсцэніраванне (ад вучняў патрабуецца ўменне не толькі даслоўна перадаць рэплікі персанажаў, але і захаваць патрэбную інтанацыю). Настаўнік будзе сачыць, каб пры пераказе захаваць стыль легенды або казкі, іх лексіку (стэрэатыпныя выразы, устойлівыя эпітэты і параўнанні, словы з памяншальна-ласкальным значэннем, казачныя формулы: зачын і канцоўку, трохразовыя паўторы і інш.).

Знаёмячы вучняў са сродкамі эмацыянальна-вобразнай выразнасці, настаўнік развівае ў вучняў *гнуткасць* голасу і вучыць іх адчуваць змены голасу ў чытанні іншых, развівае ўменне карыстацца сілай голасу, вышынёй гуку, тэмпам маўлення. Прачытаць з патрэбнай інтанацыяй і пераказаць тэкст магчыма, толькі эмацыянальна адгукнуўшыся на твор і ўсвядоміўшы, якія пачуцці і перажыванні неабходна выклікаць у слухачоў.

Пераказ дапамагае выпрацаваць у вучняў уменне творча і эмацыянальна асэнсоўваць твор і павышае ўзровень іх маўленчай культуры, ён з’яўляецца своеасаблівым падрыхтоўчым этапам да вусных і пісьмовых работ у наступных класах.

## III. Вывучэнне мастацкіх твораў з улікам іх родава-жанравай спецыфікі

*(Асновы літаратурнай творчасці вучняў)*

Аксіёмай у методыцы стала палажэнне, што паўнацэннае засваенне мастацкага твора магчыма толькі з улікам асаблівасцей яго ўспрымання вучнямі. У школьнай практыцы ў многім застаецца нерэалізаваным патэнцыял вучняў-падлеткаў на занятках па літаратуры. Мастацкія творы розных літаратурных родаў вымагаюць своеасаблівага падыходу, бо кожны з іх (эпас, лірыка, драма) валодае ярка выяўленай мастацкай спецыфікай. І паўнавартаснае ўспрыманне мастацкіх твораў немагчыма без пэўных уяўленняў школьнікаў пра іх найбольш характэрныя родава-жанравыя ўласцівасці. Праграма па беларускай літаратуры пабудавана так, што літаратурныя роды і жанры грунтоўна вывучаюцца толькі ў 8-м класе. На ўроках беларускай літаратуры пяцікласнікі спасцігаюць асноўныя адметнасці літаратурных родаў

і жанраў толькі *эмпірычна*. Крыху ратуе гэту сітуацыю тое, што на ўроках рускай літаратуры ў 5-м класе вучні атрымліваюць першаснае тэарэтычнае ўяўленне пра эпас, лірыку і драму. Таму на факультатыўных занятках настаўнік пастараецца ўзнавіць і паглыбіць пачатковыя веды пяцікласнікаў пра літаратурныя роды і жанры. На канкрэтных прыкладах ён пакажа пяцікласнікам, што ў аснове літаратурнага роду ляжыць пэўны тып адлюстравання чалавека, адрозны спосаб абмалёўкі характару ў жыццёвым працэсе — ад асобных перажыванняў (адна падзея, эпізод чалавечага жыцця) да іх комплексу (значны кавалак жыцця некалькіх людзей).

Знаёмства з любым мастацкім творам павінна засноўвацца на эмацыянальна-вобразным успрыманні, абуджэнні ў вучняў пачуццяў і ўяўленняў. Эмацыянальны кантакт чытача з настроем аўтара — зыходная ўмова ўзнікнення суперажывання. Успрыманне мастацкага твора патрабуе ад вучня актывізацыі эмоцый, пачуццяў, творчага ўяўлення, дысцыплінаванасці мысліцельнай дзейнасці. Нездарма лічыцца, што ўспрымаць мастацтва амаль гэтак жа цяжка, як і тварыць яго. І паколькі на ўспрыманне мастацкага твора ўплываюць псіхафізіялагічныя асаблівасці вучняў, іх асабісты жыццёвы і чытацкі вопыт, нават абставіны, пры якіх адбываецца знаёмства з тэкстам, — у школьнікаў непазбежна ўзнікае сваё разуменне прачытанага.

Вядома, што ў аснове ўспрымання літаратурнага твора ляжыць працэс узнаўлення мастацкіх вобразаў. У чытацкай дзейнасці школьніка галоўнае значэнне мае рэпрадуктыўнае ўяўленне — узнаўленне вобразаў у адпаведнасці з дадзеным апісаннем. Сродкі стварэння вобразаў у эпічных творах робяць лягчэйшым узнаўленне, рэпрадуктаванне, а лірычны вобраз, часам створаны адным словам, гукам, нават паўзай, узнаўляецца ва ўяўленні малодшага падлетка няпоўна і з цяжкасцю. Асобы спосаб адлюстравання рэчаіснасці ў лірыцы праз вобраз-перажыванне надае чытацкаму ўспрыманню спецыфічны характар. Калі спасціжэнне эпічных твораў выклікае неабходнасць асэнсаваць рэчаіснасць у паслядоўным, разгалінаваным руху яе падзей і вобразаў, то лірыка дае магчымасць адзіным позіркам агледзець цэлы этап жыцця (ці нават усё жыццё) і патрабуе ад чытача ўмення ўявіць тое, што «спрасавана» аўтарам у сціслых радках, і разгарнуць у цэласную карціну. Пры чытанні эпічных і драматычных твораў вобразы-персанажы, якія чытач-падлетак уяўляе як жывых, рэальных людзей, параўнальна лёгка выклікаюць у яго пэўныя эмоцыі і адносіны. У лірычным жа творы пачуцці, перажыванні, вобразна выяўленыя паэтам, абуджаюць у чытача канкрэтнае ўяўленне пра лірычнага героя (у сярэдніх класах карыстаюцца тэрмінам «асоба аўтара») і фарміруюць пэўныя адносіны да яго. У працэсе ўспрымання вучнямі вобраза-перажывання адбываецца нібыта арганічнае спалучэнне непасрэднага эмацыянальнага ўражання, узнаўлення «карціннага»

аўтарскага вобраза, асабістых асацыяцый і ўласных вобразаў-успамінаў вучняў. Вобраз-перажыванне адначасова ўздзейнічае на пачуцці, думкі, уяўленне вучняў. Калі ў аснове ўспрымання, напрыклад, пейзажнага верша ляжыць узнаўленне аўтарскіх вобразаў, то пры ўспрыманні філасофскага або грамадзянскага верша моўны змест не пераводзіцца непасрэдна ў вобраз, а дзейнічае на чытача праз эмацыянальны падтэкст твора, адпаведна якому ажываюць чытацкія ўспаміны, карціны памяці, якія надаюць паэтычным вобразам асобасны характар, узмацняюць эмацыянальнасць уздзеяння.

***Празаічныя (апавядальныя) творы на ўроку літаратуры***

Значную частку праграмы факультатыва па літаратуры ў 5-м класе складаюць празаічныя творы розных жанраў: казкі, легенды, апавяданні, урыўкі з аповесцей. Апавядальныя творы адрозніваюцца шырынёй ахопу жыцця, формай адлюстравання чалавека ў жыццёвым працэсе, будовай, спосабам выяўлення аўтарскай пазіцыі. Аднак жанравыя адрозненні не здымаюць таго агульнага, што складае сутнасць эпасу, — здольнасці паказаць жыццё ва ўсёй яго паўнаце і разнастайнасці. Да якога б жанру ні належаў твор, увага вучняў найперш будзе засяроджвацца на тых кампанентах, якія з’яўляюцца істотнымі, вызначальнымі для эпасу, — тэматыцы, праблематыцы, сюжэце, вобразах, будове, пазіцыі аўтара, якая праяўляецца ва ўсіх кампанентах твора — пафасе, кампазіцыі, стылі, характары адбору матэрыялу і г. д. Але якім бы шляхам твор ні разглядаўся, настаўніку-славесніку неабходна ўлічваць псіхалагічны момант: ведаючы надзвычайную эмацыянальнасць вучняў-падлеткаў, іх патрэбу у актыўным саўдзеле і суперажыванні, неабходна найперш зацікавіць дзяцей, выклікаць у іх жаданне прачытаць твор.

Праграма факультатыва прадугледжвае выпрацоўку ў вучняў уменняў вызначаць асноўныя эпізоды ў творы і эпізоды, важныя для характарыстыкі герояў, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж падзеямі, разумець і ацэньваць матывы паводзін і ўчынкаў герояў, высвятляць функцыю інтэр’ера, пейзажу, партрэтнага апісання, адчуваць мастацкае вобразнае слова і разумець ролю моўных выяўленчых сродкаў. Пяцікласнікаў неабходна навучыць аналізаваць творы — узнаўляць у сваім ўяўленні мастацкія карціны, створаныя пісьменнікам, сачыць за развіццём дзеяння, вызначаць тэматыку і праблематыку, заўважаць адметнасці будовы, разумець пазіцыю аўтара, асэнсоўваць і абгрунтоўваць уласныя адносіны да мастацкага тэксту, ствараць вусныя выказванні паводле вызначанай тэмы (даць характарыстыку герою, апісаць месца дзеяння, стварыць пейзажную замалёўку на падставе сваіх бачанняў і ўражанняў, прыдумаць твор з элементамі прыгодніцтва або фантастыкі, расказаць пра выпадак з жыцця, які надзвычай уразіў, і інш.). Напрыклад, цікавым для вучняў будзе заданне распавесці пра сваю хатнюю жывёліну, прыгадаўшы

якое-небудзь здарэнне, звязанае з ёю, і вусна (або пісьмова) аформіць замалёўку, папярэдне прадумаўшы ўсе этапы яе сюжэта: экспазіцыю, завязку, развіццё дзеяння, кульмінацыю, развязку.

Неабходная ўмова паўнацэннага ўспрымання апавядальных твораў — элементарнае ўяўленне малодшых падлеткаў пра родавыя і жанравыя адметнасці эпасу. Настаўнік у працэсе знаёмства з творам будзе звяртаць увагу вучняў на спосабы паказу герояў і падзей, на будову, мову. Паступова вучні ўсвядомяць, што празаічныя творы адрозніваюцца спосабам адлюстравання жыцця, арганізацыяй мастацкай прасторы і часу, моўнай структурай, увагай пісьменніка да падрабязнасцей у апісанні жыццёвых падзей, працяглых па часе, стварэннем розных чалавечых характараў, паказвае іх узаемаадносіны паміж сабой, своеасабліва выяўляе свае сімпатыі ці, наадварот, выказвае сваё непрыманне пэўных падзей ці герояў. Вучні павінны найперш разумець, што ў цэнтры апавядальнага твора — жыццё, лёс чалавека ў яго складаных і разнастайных праявах, бо тут вялікае значэнне надаецца падзейнасці: звычайна расказваецца пра які-небудзь выпадак, здарэнне, гісторыю, што адбыліся з героямі, больш ці менш падрабязна апісваюцца іх паводзіны, учынкі, дзеянні, іх унутраны свет.

Нельга абысці ўвагай і тое, што пісьменнік найбольш свабодны ў выкарыстанні шырокай палітры сродкаў мастацкай выразнасці. Пасабляюць яму ў стварэнні пэўных карцін жыцця і раскрыцці прычын, што абумовілі іх узнікненне, аўтарскія характарыстыкі, апісанні прыроды, абставін, побыту, знешнасці герояў і іх душэўнага стану, маналогі і дыялогі. Пры знаёмстве з апавядальнымі творамі вучні адразу ўяўляюць падзеі ў адпаведнай паслядоўнасці, абставіны, у якіх дзейнічаюць героі, іх аблічча, характары, усведамляюць матывы паводзін, адчуваюць псіхалагічны настрой. Мова твораў, блізкая да звычайнай гутарковай мовы, спрыяе гэтаму ўспрыманню. Галоўная функцыя слова ў прозе — паказваць, маляваць абставіны, прадметы, дзеянні, учынкі, стан чалавека.

Працуючы з пяцікласнікамі, настаўнік не можа не ўлічваць той момант, што малодшымі падлеткамі з цяжкасцю засвойваюцца тэарэтычныя пытанні (паняцці пра сюжэт, літаратурнага героя, асобу апавядальніка), бо абстрактнае мысленне ў іх знаходзіцца на стадыі фарміравання, і без дапамогі настаўніка, ад якога вучні атрымліваюць асноўныя веды, тут не абысціся. Тэарэтычны матэрыял неабходна канкрэтызаваць на прыкладах. Таксама настаўніку варта ведаць: складанасці пры вывучэнні празаічных твораў абумоўлены найперш тым, што малодшыя падлеткі ў сваёй пераважнай большасці атаясамліваюць рэчаіснасць з яе мастацкім адлюстраваннем. Ім цяжка зразумець, што пісьменнік не проста паказвае жыццё, а пераўтварае яго ў святле сваіх ідэалаў. Нарэшце, падлеткі цікавяцца пераважна падзеямі і ўчынкамі герояў і пры самастойным чытанні амаль не звяртаюць

увагі на шматлікія дэталі, апісанні, аўтарскую характарыстыку, мову. Да ацэнкі літаратурных герояў дзеці звычайна падыходзяць з суб'ектыўных пазіцый наіўнага рэалізму, са сваімі катэгарычнымі меркаваннямі і маральнымі ацэнкамі. Ва ўяўленні малодшых падлеткаў свет распадаецца на дзве сферы — абсалютнае дабро і абсалютнае зло, ім цяжка зразумець супярэчлівасці жыцця.

Мастацкі твор — складанае, цэласнае адзінства, дзе мае значэнне ўсё: час і месца дзеяння, абмалёўка характараў герояў і выяўленне іх пачуццяў і перажыванняў, апісанні карцін прыроды і таго асяроддзя, дзе адбываюцца падзеі. Працэс успрымання літаратурнага твора ўключае ў сябе знаёмства з тэкстам (чытанне або праслухоўванне), асэнсаванне яго ідэйна-мастацкага зместу і сродкаў раскрыцця аўтарскай думкі, ацэнку яго як з'явы мастацтва. Ад непасрэднага знаёмства з творам вучні атрымліваюць багацце ўражанняў, а дапамагчы ім асэнсаваць гэтыя ўражанні, узбагаціць і паглыбіць іх, праясніць ідэйна-мастацкі сэнс твора і аўтарскую пазіцыю дапаможа настаўнік у працэсе сумеснага аналізу тэксту.

Віды працы з празаічным творам на факультатыўных занятках у 5-м класе могуць быць самыя розныя: выразнае, каменціраванае, выбарачнае чытанне, чытанне па асобах (ролях), гутарка, складанне плана, пастаноўка пытанняў і адказы на іх, пераказ, вуснае выказванне (аповед, апісанне, разважанне, маляванне словамі), назіранні за будовай, асобай аўтара, мовай. Яны залежаць ад ідэйна-мастацкай спецыфікі твора, навучальных задач, падрыхтаванасці і магчымасцей вучняў, майстэрства настаўніка.

Аналізуючы мастацкі твор, настаўнік перш за ўсё звяртае ўвагу вучняў на выбар пісьменнікам жыццёвага матэрыялу — тэму, на разуменне, ацэнку аўтарам гэтага матэрыялу, г. зн. на галоўную думку твора — мастацкую ідэю (якая выяўляецца праз сюжэт і форму яго падачы, вобразны лад), на супастаўленні і супрацьпастаўленні герояў, дэталі, апісанні, на аўтарскую пазіцыю. Галоўнае — данесці да вучняў багаты свет мастацкага твора, забяспечыць паўнавартаснае разуменне ідэйна-тэматычнага і эмацыянальна-вобразнага зместу. Прасцей дасягнуць гэтай мэты пры аналізе невялікага па аб'ёме тэксту, дзе ёсць магчымасць яго падрабязна разгледзець па эпізодах. Па ходу сюжэта вучні сочаць за развіццём дзеяння, знаёмяцца з персанажамі, даследуюць адметнасці кампазіцыі і стылю твора. Такая работа дапаможа настаўніку скіраваць увагу вучняў на мастацкую структуру тэксту, моўныя выяўленчыя сродкі, прасачыць рух аўтарскай думкі. Калі ж у цэнтры ўвагі вялікі па памеры твор, асобае значэнне набывае адбор матэрыялу, вызначэнне акцэнтаў у яго інтэрпрэтацыі.

Натуральна, на факультатыўных занятках не могуць быць аднолькава глыбока разгледжаны ўсе кампаненты кожнага праграмнага твора. Патрэбна мэтанакіраваная выбіральнасць аналізу, падпарадка-

ваная пэўным выхаваўчым і адукацыйным задачам. Ступень дэталізацыі, глыбіню аналізу настаўнік вызначыць у адпаведнасці са спецыфікай вобразнага ладу твора і мэтамі канкрэтных заняткаў. Безумоўна, не застануцца без увагі асноўныя падзеі і прычынна-выніковыя сувязі паміж імі, абумоўленасць і мэтазгоднасць размеркавання частак або раздзелаў твора, цэласнасць характараў на аснове аналізу і супастаўлення фактаў, моўная плынь.

Вылучэнне вобразаў з адзінай мастацкай тканіны твора — працэс няпросты, пры ім лёгка парушыць цэласнасць успрымання, хоць аналіз невялікіх па аб'ёме твораў ладзіцца як працэс удумлівага ўчытвання ў тэкст і далейшага абагульнення. Важна, каб твор у працэсе аналізу не распадаўся ва ўяўленні падлеткаў на кавалачкі — структурныя элементы, а быў успрыняты ў суаднесенасці з агульнай задумай пісьменніка. Каб пераадолець вучнёўскае ўражанне раздробленасці твора падчас яго аналізу, настаўніку варта папераменна факусіраваць увагу дзяцей на розных элементах вобразнай сістэмы (персанажах, сюжэце, будове, асобе аўтара, пейзажы і інш.), пазбягаць схематызму ў аналізе характараў, ажыўляць канкрэтна-вобразныя ўяўленні школьнікаў і ствараць умовы для захавання іх эмацыянальных рэакцый.

Не варта нават з малодшымі падлеткамі зводзіць працу з тэкстам толькі да пераказу, складання плана, размоў пра падзеі. Аналіз мастацкага твора на любым этапе адукацыі мусіць быць дастаткова змястоўным. У пятым класе галоўнае — *асэнсаванне сюжэтнай лініі і ацэнка ўчынкаў і перажыванняў герояў у цэнтральных эпізодах твора*. Назіранні за будовай твора, жанравымі адметнасцямі, мовай, аўтарскімі адносінамі да адлюстраванага назапашваюцца ў выглядзе канкрэтных назіранняў, але наўрад ці могуць стаць прадметам для абагульнення.

Адзін з важных структурных кампанентаў твора — *сюжэт* — паслядоўнае разгортванне падзей, у якіх выяўляюцца характары і ўзаемаадносіны герояў. Малодшыя падлеткі звычайна ацэньваюць дасканаласць сюжэта з пункту гледжання падабенства яго да жыццёвых з'яў. Пачатковае паняцце пра сюжэт і асноўныя яго этапы (экспазіцыю, завязку, развіццё дзеяння, кульмінацыю, развязку) вучні атрымліваюць у пятым класе, да гэтага часу карысталіся выразам «ланцужок падзей». Яны вылучаюць асноўныя эпізоды, сочаць за паслядоўным развіццём дзеяння, умеюць скласці план казкі або апавядання.

Даволі цяжка пяцікласнікам аналізаваць асобны *эпізод* (сцэну). У методыцы эпізод выдзяляецца ў асобную структурную адзінку мастацкага цэлага, якая нясе ў сабе адбітак гэтага цэлага і адлюстроўвае яго законы. Кожны эпізод — заўсёды адно са звёнаў ланцужка падзей. Аднак часам на практыцы эпізод аказваецца выключаным з агульнай мастацкай структуры твора. Пры самастойным аналізе эпізоду вучні не ведаюць, з чаго пачаць, на якія элементы мастацкай структуры звяр-

нуць увагу, як тлумачыць вобразы, што трапілі пад увагу. Як правіла, школьнікі найперш скіроўваюць свой погляд на канкрэтную падзею, імкнуцца ацаніць, як паводзіць сябе галоўны герой у пэўнай сітуацыі. А заўважыць другарадныя вобразы і дэталі і прасачыць іх узаемасувязь малодшым падлеткам цяжка, і эпізод падчас аналізу звычайна распадаецца на шэраг самастойных карцін. Таму настаўніку варта разнастаіць прыёмы аналізу пры разглядзе розных эпізодаў аднаго твора, падбіраць свой «ключык», свой ракурс разгляду, засяроджваць увагу вучняў на тым, як эпізод уключаны ў сюжэт, як раскрываюцца ў ім характары герояў, якія праблемы вырашаюцца.

Эпізод, які аналізуецца на занятках тэкстуальна, набліжае героя і аўтара да чытача, дазваляе ў падрабязнасцях убачыць праяўленні канкрэтнага характару ў пэўных абставінах і больш пільна разгледзець самі абставіны. У пятым класе пры аналізе эпізоду звычайна на першы план выступае падзея, сюжэт, на больш познім этапе навучання ўвагу вучняў неабходна сканцэнтраваць на ўчынках і (што асабліва важна) на перажываннях герояў, аўтарскай канцэпцыі жыцця і характараў.

Зыходная ўмова аналізу эпізоду — абуджэнне *эмацыянальных адносін* вучняў да апісаных падзей. Таму і заданні варта падбіраць такія, што прадугледжваюць эмацыянальны водгук дзяцей і выклікаюць у іх суперажыванне: чытанне эпізоду ці яго часткі, ацэнка вучнямі выказванняў і перажыванняў героя, яго псіхалагічнага стану, матывіроўка паводзін, не растлумачаных аўтарам, і да т. п. Такім чынам, можна акрэсліць прыкладныя этапы аналізу эпізоду:

а) высвятленне ўражання вучняў ад пэўнай сцэны;

б) вызначэнне месца сцэны ў сюжэце твора, яе ролі і значэння ў характарыстыцы персанажа;

в) перачытванне сцэны і яе тэкстуальны аналіз, які суправаджаецца ўчытваннем у тэкст, яго перажываннем і асэнсаваннем;

г) новае, глыбейшае ўспрыманне эпізоду як часткі ў цэласнай структуры твора.

Самы складаны этап у аналізе — выхад за межы эпізоду і ўстанаўленне ўзаемасувязі асобных элементаў мастацкай структуры твора. Эпізод настаўнік мусіць тлумачыць у перспектыве сюжэтнага руху, паказаць яго ролю ў раскрыцці галоўнай ідэі твора. Не ўлічваючы агульнага пафасу твора, можна ўвогуле няправільна зразумець той ці іншы эпізод. Таму задача настаўніка — дапамагчы вучням бачыць ідэйна-тэматычную аснову пэўных сцэн, эмацыянальную напружанасць іх мастацкай формы, асаблівасці счаплення вобразаў.

Вучням неабходна ўсвядоміць, што мастацкі твор мае *сістэму вобразаў* (вобраз-персанаж, вобраз аўтара, вобраз-інтэр'ер, вобраз-пейзаж, вобраз-перажыванне, вобраз-сімвал), створаную аўтарам, каб выклікаць у чытачоў пэўны водгук. У цэнтры эпічнага твора знаходзіцца

вобраз-персанаж, ён не можа ўспрымацца ізалявана ад усёй вобразнай сістэмы. Уласцівая падлеткаваму ўзросту цікавасць да навакольнага свету і асобы чалавека, яго маральнага і духоўнага вобліку спрыяе засваенню паняцця «літаратурны герой». Малодшыя падлеткі ў літаратурных героях бачаць жывых людзей, хвалююцца і радуюцца за іх, як за канкрэтных асоб. Гэта не значыць, што вучні зусім не разумеюць мастацкай умоўнасці. Яны нібыта і ведаюць, што вобраз героя — плён фантазіі пісьменніка, але працягваюць думаць пра яго і ацэньваць яго, як рэальную асобу. У вучнях жыве чытач, які «прымервае» героя ў на сябе, суадносіць з імі свой асабісты вопыт. Без гэтага эфекту прыпадабнення зносіны чытача з мастацтвам робяцца збедненымі. Дзякуючы гэтай асаблівасці дзіцячага ўспрымання дасягаецца найбольш моцнае ўздзеянне твора. Таму не варта знішчаць у малодшым падлетку каштоўную дзіцячую ўласцівасць бачыць у героі чалавека і па-свойму прымаць або не прымаць яго. Менавіта праз спасціжэнне літаратурнага героя школьнікі прывучаюцца бачыць у жыцці і літаратуры багацце чалавечых індывідуальнасцей і тыпаў, разумець дыялектыку характараў і адносін паміж людзьмі.

Каб зразумець ідэю вобраза героя, надзвычай важным з’яўляецца абагульненне. Абагульняльныя моманты звычайна прысутнічаюць у рабоце над персанажам і тады, калі ён разглядаецца ў канкрэтнай сітуацыі. У пятым класе абагульніць уяўленні вучняў аб героі можна з дапамогай пытанняў, якія патрабуюць выяўлення матываваных асабістых адносін да яго, напрыклад:

- Чым вам падабаецца (не падабаецца) герой?
- Што ён за чалавек (асоба)?
- Чаму вы хацелі б (ці адмовіліся б) сябраваць з героем?
- Што прываблівае (ці абурае) вас у героі?
- Як вы ацэньваеце яго паводзіны і разважанні?

Пры аналізе вобраза героя падчас назіранняў, ацэнак, абагульненняў, выяўлення аўтарскай пазіцыі вучні спасцігаюць прыёмы стварэння вобраза-персанажа і паступова авалодваюць уменнямі самастойна яго аналізаваць. Настаўнік дапамагае вучням прыйсці да высновы: каб зразумець літаратурнага героя, патрэбна звярнуць увагу на апісанне яго знешняга выгляду (партрэт), узаемаадносіны з іншымі персанажамі, паводзіны, учынкі, перажыванні, мову, аўтарскую ацэнку, побытавыя і пейзажныя замалёўкі. Неабавязкова пры разглядзе кожнага персанажа даследаваць усю сістэму прыёмаў яго стварэння, але настаўнік абавязаны ўзброіць гэтымі ведамі і ўменнямі малодшых падлеткаў, каб прывучыць дзяцей звяртаць увагу на тыя моманты ў тэксце, якія дапамагаюць абмаляваць вобраз. Гэтыя веды і ўменні паступова назапашваюцца і сістэматызуюцца вучнямі. Каб дапамагчы пяцікласнікам выпрацаваць уменне асэнсоўваць прыёмы стварэння вобраза-персанажа, можна прапанаваць *прыкладны* план разгляду:

а) партрэт;

б) умовы і абставіны, у якіх жыве герой;

в) перажыванні і найбольш характэрныя ўчынкі героя;

г) узаемаадносіны з іншымі персанажамі;

д) мова героя (выказванні і развažанні ў дыялогах і маналогах);

д) адносіны аўтара да героя.

Такі план не перашкодзіць жывому вучнёўскаму стаўленню да літаратурнага героя і навучыць дзяцей бачыць і разумець прыёмы яго паказу ў мастацкім творы, каб самастойна яго характарызаваць.

Пяцікласнікам трэба патлумачыць, што для таго, каб вобраз чалавека (або жывой істоты) вырысоўваўся больш наглядна і яго лёгка можна было ўявіць, пісьменнік апісвае знешні выгляд героя, яго твар, фігуру, вопратку, жэсты, міміку, рухі, г. зн. стварае яго *партрэт.* Звычайна партрэт героя ў творы бывае зменлівы, жывы, рухомы, часам ён даецца не ў адным месцы цалкам, а складаецца з асобных апісанняў, і толькі ўсе яны разам даюць цэласнае ўяўленне пра асобу. Варта абавязкова паказаць гэта ўрыўкамі са знаёмага тэксту, напрыклад з апавядання Янкі Брыля «Маці»:

«Жнучы, яна стамлялася з кожным днём усё больш. Гарачую задуху цяжка было адмахнуць *ад знямоглых грудзей* нават самай вялікай, самай каласістай жменяй. А рабіць трэба было, хоць і свету не бачыш... І яна жала, нікому нічога не кажучы.

Увечары, вяртаючыся дахаты са сваім наймалодшым, у тое страшнае лета адзіным у хаце сынам, *старая ледзь перастаўляла ногі, натруджаныя гадамі бязлітаснай працы. Паблеклыя вочы* яе глядзелі на свет з-пад *нізка насунутай* хусткі, *здаецца*, зусім *абыякава…*»;

«За вялізнай узорнай дзяругай цераспалосіцы, недзе далёка-далёка за ўзгоркам, патухала зара, а зусім блізка ад мяжы, па якой яны ішлі, стаяў <u>пахілы мэндлік жыта.</u> Уранні па нівах, з гары ў даліну, прайшоўся нізам вецер і панасоўваў мэндлікам шапкі на самыя вочы. Мала таго, каторы слабей пастаўлены, дык і ўсяго яго ці нахіліў, ці нават абярнуў зусім. Той, на які паказвала маці, <u>нахілены ўсімі снапамі ўздагон ранішняму ветру</u>, што быў ужо на другім канцы свету, — той <u>не хацеў упасці</u>. І с*тарая жняя ўсміхнулася, гледзячы на яго амаль таксама ўлюбёна ў жыццё, як у тыя гады, калі яна была парабчанкай у панскім двары і не ведала стомы, бегаючы вакол чужога шчасця».*

«Свае *худыя, так мала ў жыцці цалаваныя рукі яна трымала мазалямі да мазалёў*. Шаптала свае, зусім новыя словы малітвы. І ў ранішнім святле роднага сонца *ясным быў яе твар, хоць па маршчынах міжвольна каціліся... слёзы*».

Так, пры дапамозе партрэта пісьменнік дае зразумець, што сялянская жанчына (маці) пражыла цяжкае жыццё, стамілася за гады непасільнай працы, зведала шмат гора і стала *нібыта* абыякавай да ўсяго.

Каб пяцікласнікі змаглі зрокава ўявіць гераіню, важна, каб яны заўважылі ў апісаннях выразныя падрабязнасці: нізка насунутую на лоб хустку, серп на плячы, нямоглыя грудзі, пабляклыя вочы, якія, *здаецца, зусім абыякава* глядзелі на свет. Яна вельмі стамілася за жыццё, стамілася ад непасільнай працы, ад трывогі за сыноў, ад роздумаў пра ваеннае ліхалецце. Маці была засяроджана на сваіх думках — пра сваю горкую долю, цяжкую працу, жыццёвыя выпрабаванні, таму і вочы здаваліся абыякавымі. Аднак далейшыя падзеі паказалі, што гераіня апавядання зусім не абыякава ставілася да жыцця. Заўважыўшы на полі адзінокі, пахілы пад ветрам, але няскораны мэндлік жыта, маці змянілася: усміхнулася, нават з выгляду памаладзела, радуючыся гэтаму стойкаму да выпрабаванняў мэндліку і... жыццю. Яна аказалася надзвычай чулай да чужой бяды — ахвяравала сваім жыццём, прытуліўшы збегшых з палону чырвонаармейцаў.

У трэцім фрагменце-апісанні перад намі паўстае босая, без хусткі (не паспела накінуць) старая зморaная жанчына, аднак яна ідзе павольна, шэпчучы словы малітвы і словы любові і развітання з дзецьмі, з жыццём. І думкі яе засяроджаны не на сабе. Янка Брыль гаворыць: «Яна не ведала, хто яна». Дык хто ж яна, гэта простая беларуская сялянка? На гэта пытанне хай адкажуць самі вучні.

Невялікі памер апавядання паглыбляе ролю кожнага слова ў тэксце. Асаблівае значэнне ў такім тэксце набывае *мастацкая дэталь.* Жытнёвы мэндлік і ёсць так званая мастацкая дэталь, выразная падрабязнасць. Сама па сабе напрошваецца аналогія: маці, якая за доўгія гады зведала столькі цяжкіх выпрабаванняў, але няскоранай, нязломнай крочыла па жыцці, параўноўваецца з мэндлікам жыта на полі, які насуперак усяму *не хацеў упасці.* Тут пяцікласнікам варта патлумачыць, што мастацкая дэталь — першааснова твора, зыходная ячэйка, дзе, як у кроплі вады, адбіваюцца і ідэйныя, і маральныя, і эстэтычныя погляды паэта, адметнасць яго вобразаў, непаўторнасць мастацкіх карцін, арыгінальнасць асацыяцый. Яна звычайна абуджае ў чытача шэраг успамінаў, ланцужок знаёмых вобразаў, карцін, перажыванняў, прымушае працаваць творчае ўяўленне, ажыўляе жыццёвыя аналогіі, актывізуе разумовыя здольнасці, дапамагае заўважаць сувязі паміж нібыта рознымі з'явамі і рабіць адпаведныя высновы. Пры дапамозе дэталі твор успрымаецца больш ярка і эмацыянальна.

Партрэт не толькі робіць вобраз знешне ўяўным, наглядным, ён яшчэ выяўляе характар чалавека, а таксама паказвае стаўленне аўтара да свайго героя. Так, напрыклад, стары мікалаеўскі салдат дзед Астап у святочныя дні любіў *урачыста* прайсціся па станцыі і пахваліцца сваімі срэбнымі медалямі, *важна* начысціўшы боты і яшчэ *важней* — свае медалі. Аўтар ставіцца да свайго героя з лёгкім гумарам, ён пасвойму сімпатызуе старому і разам з тым злёгку пасміхаецца з яго жадання выглядаць усімі паважаным чалавекам, сапраўдным геро-

ем, больш аўтарытэтным і значным, асабліва для начальства чыгункі і прадстаўнікоў улады:

«Дзед Астап быў старым мікалаеўскім салдатам, служыў вартаўніком у дэпо, меў два срэбныя медалі за турэцкую вайну. У святочныя дні дзед *важна* чысціў свае боты, потым *яшчэ важней* цёр мелам свае медалі і, павесіўшы іх на грудзі, *урачыста* ішоў на станцыю, каб людзям сябе паказаць, як казаў ён, і на людзей падзівіцца. Прыйшоўшы са станцыі, дзед звычайна *хваліўся*:

— Іду гэта я аж каля самага жандара, а ён *перада мной у струнку* так і *выцягнуўся*... Бач, значыць, *герой ідзе*. А то яшчэ генерал мне насустрач... старэнькі такі... Ну, я пад казырок яму, а ён, не разгледзеўшы добра, сляпы, як відаць, *стаў ва фрунт*... Відаць, *падумаў, што я яшчэ вышэйшы генерал...*

Тут дзед *важна* стукаў сябе па грудзях, каб забразгалі медалі, каб відаць было, які ён, дзед Астап, ёсць *герой* на свеце, *якога нават жандары і генералы баяцца, пад казырок бяруць*» (*Міхась Лынькоў.* «Міколка-паравоз»).

Надзвычай выразным, дэталізаваным з’яўляецца і апісанне гаротнай кошкі, якую, відавочна, аўтар вельмі шкадуе, бо яе лёс (па віне людзей) аказаўся вельмі незайздросны: «Яна была старая, рыжая з *кароткімі адмарожанымі вушамі і заўсёды сумнымі вачыма*. Яшчэ *змалку ёй прышчамілі голаў*, і яна *страціла голас і ўжо зусім не мяўкала*, а толькі неяк *бездапаможна і бязгучна разяўляла рот*. Прыбілася яна сюды ў крайнюю з вёскі хату яшчэ *нэндзным, выкачаным у сажу* кацянём. Тут яна пражыла шэсць гадоў, пастарэла і *пачала аблазіць*. Яе цяпер *сталі гадзіцца, выганяць з хаты і біць чым папала* — венікам, матузамі, іншы раз дык проста нагамі. Два разы яе зносілі з дому — першы раз не так далёка — у мястэчка, адкуль яна вярнулася ў той жа самы дзень, другі раз у горад — за сорак кіламетраў... З горада яна прыйшла нешта праз месяц, прыйшла *худая, зношаная і ледзь жывая, на ёй былі толькі скура ды косці*. Але за восень яна выкачалася, акрыяла і, здаецца, памаладзела» (*Вячаслаў Адамчык.* «Сонечны зайчык»).

Важным сродкам стварэння вобраза, характарыстыкі персанажа з’яўляецца паказ *перажыванняў* і *паводзін* героя, апісанне яго душэўнага стану, эмацыянальнага ўзрушэння падчас жыццёвых выпрабаванняў. Прыгадаем на фоне апісання прыроды хваляванні кошкі Муркі, калі яна, згубіўшыся ў лесе, шукала дарогу дадому, на лецішча да сваіх гаспадароў:

«Бегла шпарка, пераскоквала струхлелыя пні і карчы і ўвесь час *падбадзёрвала* сябе. Зараз, за тымі вунь соснамі, павінна адкрыцца знаёмая сцежка. Але яе ўсё не было і не было. Я спынілася, пачала азірацца і *разгубілася канчаткова*. Сосны наўкола незнаёмыя, раней яны мне не страчаліся. Нізіна наперадзе нейкая... І густы, як сцяна,

маліннік... Адкуль ён тут? *Няўжо заблудзілася*? Трэба ўскараскацца куды-небудзь вышэй і азірнуцца як след.

Учарнелы пень быў паблізу, і я ўскочыла на яго. За сасновым голлем блiснула сонца, і гэта мяне *абнадзеіла*. Сонца, калі я на беразе возера цягнула галінку ў зубах, было якраз над машынаю. І таму зараз трэба бегчы ў той бок, дзе сонца. І не па сцежцы бегчы, а напрасцяк — бліжэй будзе!

Бегла я доўга. Але лес рабіўся ўсё гусцейшы. І сонца некуды схавалася, і разбалеўся нос, які ўджаліла аса, і нечакана залапатаў па сасновым голлі дождж, і лес застагнаў пад моцнымі парывамі ветру. Потым зусім блізка, як не над самай галавою, быццам дошка зламалася, прагучала працяглае і рыпучае:

— Чуч-ч-чаго... Чуч-ч-чаго...

*Жах агарнуў* гэтак жа, як і ў той міг, калі давялося ўбачыць каршуна. Адно *ў галаве завіравала: ратуйся*, Мурачка!»

Апісаны душэўны стан Муркі (а яна ў творы надзяляецца сапраўднымі чалавечымі эмоцыямі, перажываннямі, разважаннямі) псіхалагічна падрыхтоўвае чытача, настройвае на чаканне блізкага няшчасця, як бы ўводзіць яго ў атмасферу тых драматычных падзей, пра якія ён хутка даведаецца.

Пейзаж сугучны хваляванням Муркі, якая адчувае, што наперадзе — сур'ёзныя жыццёвыя выпрабаванні: «Мінуўшы бярозавы чубок, я перабегла поле і ўбачыла пясчаную *дарогу з глыбокімі каляінамі*. Узмежкі, аднак, былі затравелыя, роўныя, і я спачатку ішла па адным баку дарогі, потым перабралася на другі, бліжэй да бухматых лазнякоў, якія з дуба здаваліся нізенькімі кустамі. Потым *лазнякі прапалі*, паабапал дарогі *чарнеў густы сасоннік*. *Каляіны* ў ім *дзіўна вілялі*, і мне нават падалося, што я зноў, як у лесе, заблудзілася. Спынілася нават. *Наўкола была густая, быццам сцяна, цемра*.

Сасоннік скончыўся раптоўна, як бы адскочыў назад, і перада мною разлеглася поле, за якім акрэсліваліся *вялікія цьмяныя пабудовы*. *Чорнае*, дужа *нізкае неба* над імі, нечакана пакрэсліла *звілістая маланка*. Потым адтуль данесліся *глухія грымоты* і следам за імі *налящеў віхор, усё наваколле загуло, як бы затрэслася*. Пачуўся знаёмы пошум дажджу. З *чорнай* высі, *быццам з вялізных ночваў, паліліся пругкія халодныя струмені*» (*Алесь Савіцкі.* «Прыгоды Муркі»).

У гэтым апісанні адчуваецца ледзь улоўная трывога, прадчуванне непрыемнасцей, з якімі сутыкнецца ў незнаёмым лесе самотная кошка.

У стварэнні вобразаў асобая ўвага надаецца пейзажу, праз яго вучні ўзбагачаюцца эстэтычнымі ўяўленнямі, пазнаюць прыроду. Мастацкі матэрыял праграмы дае магчымасць яшчэ больш пашырыць уяўленні вучняў аб ідэйна-эстэтычнай ролі пейзажу. На канкрэтных прыкладах настаўнік пакажа, што часта пейзаж у мастацкім творы з'яўляецца адным са шляхоў выяўлення аўтарскага светаўспрыман-

ня. Замалёўкі прыроды ў творы заўсёды вылучаюцца характарам бачання самога пісьменніка, багаццем яго асацыяцый. Таму аналіз пейзажу з'яўляецца істотным момантам у спасціжэнні аўтарскай канцэпцыі жыцця, у разуменні пазіцыі аўтара. Апісанні прыроды ў мастацкім творы раскрываюць унутраны свет героя, яго псіхалагічны стан, выразней высвечваюць характар, дапамагаюць чытачу адчуць усю глыбіню перажыванняў персанажа, больш ярка падкрэсліваюць яго настрой і душэўныя хваляванні. Паколькі ў школе менавіта гэта функцыя пейзажу разглядаецца даволі часта, існуе пагроза ўзнікнення ў свядомасці вучняў пэўнага штампа: як толькі яны сутыкаюцца ў творы з апісаннем прыроды, адразу пачынаюць шукаць яго «службовую функцыю» — сугучнасць або кантрастнасць настрою героя. Таму настаўніку неабходна дамагацца, каб пяцікласнікі абавязкова зрокава ўяўлялі, «бачылі» аўтарскае апісанне прыроды, умелі ўзнаўляць у сваім уяўленні абмаляваныя пісьменнікам карціны і фарбы прыроды:

«Быў май месяц; паветра было яшчэ досыць халоднае, але ўсё ў прыродзе — і кустоўе, і дрэвы, і палі, і лугі — паказвала, што бярэ сваё вясна. Лугі стракацелі кветкамі; пачыналі цвісці, красаваць кветкі і на жывой загародзе, а непадалёку пышнела ўвасабленне самой вясны — маленькая яблынька нібы ў вэлюме. Асабліва прыгожая была на ёй адна галіна, маладзенькая, свежанькая, уся ўсыпаная пяшчотнымі ружовымі бутонамі, што яшчэ не як след разгарнуліся. Яна сама ведала, якая яна прыгожая; усведамленне красы было ў яе ў соку» (*Ханс Крысціян Андэрсен.* «Ёсць жа розніца!»). У гэтым урыўку алегарычнай казкі вясновы пейзаж знітаваны з апісаннем (па сутнасці, партрэтам, паколькі казка алегарычная, і пад галінкай аўтар падразумявае чалавека) маладзенькай яблыневай галінкі. Відавочна, што гэта толькі першая згадка аб прыгажуні-галінцы. Аўтар адразу рыхтуе чытача да разумення сутнасці характару галінкі — ганарыстай легкадумнай прыгажуні, якая, толькі з'явіўшыся на свет, патрабуе да сябе асобага стаўлення, лічыць сябе найдасканалейшай істотай. Пісьменнік настройвае чытача на працяг яе гісторыі. Некаторыя (найбольш уражлівыя і назіральныя) пяцікласнікі ўжо з першых радкоў твора адчуваюць стаўленне аўтара да сваёй гераіні і здагадваюцца, што ў казцы абавязкова павінен праявіцца эгаістычны характар галінкі (а гэта сведчыць пра больш якаснае ўспрыманне мастацкага твора). Але каб зразумелі ўсе вучні, настаўнік мусіць абавязкова звярнуць ўвагу астатніх дзяцей на гэты момант.

Нельга не адзначыць, што мастацкія апісанні прыроды часам успрымаюцца вучнямі як нецікавыя, лішнія (асабліва ў апавядальных творах), і дзеці часта прапускаюць іх пры самастойным чытанні. Гэта акалічнасць павінна настроіць настаўніка на сур'ёзную працу, каб пераадолець гэту вучнёўскую эстэтычную абыякавасць. Навучыць пяцікласнікаў суперажываць разам з аўтарам, адчуваць мастацкую сілу

пейзажу надзвычай важна для выхавання дзяцей. Вельмі дарэчы будзе самастойная творчая праца вучняў. Напрыклад, можна прапанаваць вучням для разгляду прыродаапісальныя ўрыўкі з твораў і паставіць пытанні, падрыхтоўка адказаў на якія будзе вымагаць удумлівага прачытання і аналізу. Можна ўключыць у заданне пытанні для развіцця творчага ўяўлення школьнікаў, іх умення ўспрымаць і разумець мастацкі вобраз, абапіраючыся на ўласныя жыццёвыя назіранні і ўражанні:

• Які час апісваецца ва ўрыўку?

• Які настрой выклікае ў вас гэты малюнак?

• Як вы разумееце мастацкі вобраз...?

• Адшукайце найбольш яркія, паэтычныя вобразы ў прапанаваным урыўку. Назавіце з'явы прыроды, якія тут увасоблены.

• Ці звязана апісанне прыроды з настроем героя, з наступнымі падзеямі?

Гэта праца не патрабуе вялікіх высілкаў, але яна будзе ўплываць на выпрацоўку назіральнасці, увагі да слова і вобраза, а ў канчатковым выніку — і на развіццё творчых здольнасцей, мастацкага пачуцця, эстэтычнага густу. Выкананне такіх заданняў можна арганізаваць на факультатыўных занятках або прапанаваць папрацаваць дома. Па выніках самастойнай працы пяцікласнікаў настаўнік можа меркаваць, наколькі асэнсавана падышлі вучні да выканання задання, ці могуць яны творча мысліць, цэласна ўявіць апісаную карціну, ці разумеюць сувязь асобных дэталяў, наколькі трывала засвоілі матэрыял па тэорыі літаратуры. Да таго ж настаўнік атрымае пэўнае ўяўленне пра ўзровень літаратурнага і эстэтычнага развіцця пяцікласнікаў.

Ужо з пятага класа неабходна вучыць школьнікаў заўважаць і вызначаць *пазіцыю аўтара* — яго погляды і жыццёвыя прынцыпы, яго ацэнку адлюстраваных падзей, асабістае стаўленне да героя, што выяўляецца праз манеру аповеда, партрэтную характарыстыку або пейзажную замалёўку, лексіку, аўтарскую інтанацыю і г. д. Менавіта ўвага да аўтарскай пазіцыі падчас аналізу твора выключае «бытавы», наіўна-рэалістычны падыход да персанажа. Напрыклад, цалкам дарэчнымі ў гэтым кантэксце будуць такія пытанні:

• З якім пачуццём апісвае аўтар героя?

• Як аўтар раскрывае душэўны стан героя?

• Якія словы сведчаць пра сімпатыю аўтара да героя (непрыманне аўтарам чалавечых якасцей, разважанняў, паводзін героя)?

• Прывядзіце канкрэтныя прыклады з тэксту, якія выяўляюць адносіны пісьменніка да героя.

Пад уплывам падобных заданняў школьнікі паступова прывучаюцца бачыць у творы аўтара, яго стаўленне да герояў і падзей. На некалькіх нешматслоўных прыкладах з тэксту апавядання Вяча-

слава Адамчыка «Сонечны зайчык» праанлізуем адносіны аўтара да сваіх персанажаў — да старой кошкі і яе гаспадароў:

«Дадому яна прыходзіла, каб напіцца вады, выграцца на печы. Але там, раскінуўшы рукі, *граў носам сам гаспадар*, і яна толькі баязліва паглядала на яго *пухлы кулак, што звісаў над пячурай*»;

«І яе тут жа *секлі вострыя і надта пякучыя матузы* — гэта, вядома, гаспадыня, гаспадар дык проста *біў яе сваім цвёрдым, як камень, кулаком. Біў ён не шкадуючы, моцна.* Аднаго разу *яна ледзь устала з зямлі і болей пабойвалася заходзіць у хату*».

Відавочна, аўтарская сімпатыя на баку гаротнай кошкі, а да яе гаспадароў аўтар ставіцца з непрыхаваным асуджэннем, непрыязнасцю, хоць прама пра гэта ў тэксце не гаворыцца. Пра адносіны аўтара да людзей — гаспадара з гаспадыняй — можна меркаваць па тых нешматлікіх, але выразных момантах, калі расказваецца пра тое, як яны жорстка білі бедную жывёліну, здзекаваліся з яе. У наступных фрагментах тэксту таксама ўскосна выяўляюцца аўтарскі боль і спачуванне жахлівай кашэчай доляй. Пра гэта сведчаць азначэнні ў апісанні кошкі, і злавесны вобраз неба, і кантраснае апісанне кашэчых пакут і смерці на фоне вясёлага зязюлінага кукавання:

«*Неба* на ўсходзе *аблівалася крывёю*. *Сумная і адзінокая*, яна варочалася дадому, каля нечых веснікаў наткнуўшыся на сабаку...»;

«Яна нават не ўбачыла, што гэта былі паляўнічыя, і нават не паспела апомніцца. Раптоўна грымнулі два запар стрэлы, моцна, як гром, аглушыўшы яе. Ёй здалося, што ў зайчаняці між вушэй зачырванелася кроў, і раптам гэтая кроў стала чарнець: перад вачыма ў яе стаялі кацяняты, гэтакія вялікія, з белымі лапкамі, кропля ў кроплю бацька. Раптам усё знікла, раптам стала ціха. Але яна ўжо не чула гэтай цішыні. Недзе далёка над рэчкаю двойчы адгукнулася і мякка рассыпалася рэха. Недзе там *кукавала зязюля, кукавала яна пра шчырую вясну і сваю вясёлую долю* і, пэўна, не ведала і не гадала, што ў гэтую чыстую раніцу *нехта плача па дзецях, і нехта паміраe, страціўшы іх*».

Каб спасцігнуць аўтарскую пазіцыю, патрэбны пэўны чытацкі талент — багатае ўяўленне, уменне «бачыць» і разумець падзеі, апісаныя ў творы, суперажываць героям. Аўтарская пазіцыя выразна выяўляецца і ў адборы матэрыялу, і ў абмалёўцы характараў, і ў апісанні карцін прыроды і таго асяроддзя, дзе адбываюцца падзеі. Пэўную цяжкасць для вучняў уяўляе разуменне таго, што ў мастацкім пейзажы адлюстроўваюцца думкі і пачуцці самога аўтара. Гэты момант спачатку лепш тлумачыць на лірычных творах, дзе аўтарскія перажыванні выказваюцца больш непасрэдна.

Аповед у творах малой эпічнай формы звычайна вядзецца ад імя аўтара. Ён не толькі стварае карціны жыцця і расказвае пра падзеі, лёс герояў, але і дае ім ацэнку, раскрывае свае погляды на жыццё, выяўляе сваю пазіцыю. Напачатку літаратурнай адукацыі малодшыя падлет-

кі цалкам атаясамліваюць аўтара з біяграфічнай асобай — рэальным, канкрэтным пісьменнікам. Паступова гэта паняцце напаўняецца дадатковым сэнсам: вучні атрымліваюць уяўленне пра вобраз аўтара-апавядальніка (які нібыта толькі збоку назіраў за падзеямі і потым распавёў пра іх) і аўтара-героя — непасрэднага ўдзельніка апісаных падзей, пра якія ён потым расказаў чытачам. У гэтым выпадку персанаж, ад імя якога вядзецца аповед, раскрываецца больш глыбока, ярка, поўна, бо праз яго непасрэднае ўспрыманне падаюцца падзеі, раскрываюцца людскія характары, малююцца карціны жыцця. Таму падчас разгляду канкрэтнага твора варта адразу высвятліць, ад чыйго імя прамаўляе аўтар, напрыклад:

«Па-рознаму называюць возера: хто Лебядзёўкай, а хто Лебядзіным Дном.

Некалі, даўным-даўно, возера было настолькі агромністае, што займала ўсе мясцовыя абшары. Такія хвалі на ім уздымаліся, нібы на якім сінім моры. Людзі, якія жылі на яго прыгожых пясчаных берагах, лавілі рыбу (а яе ў возеры было гэтулькі, што самы занядбаны гультай мог заўсёды прынесці дамоў столькі, колькі захоча), палявалі на качак, якіх нават вэндзілі на зіму. А як пойдуць касіць сена, то здавалася, што навокал існавала яшчэ адно мора — зялёнае» (Легенда «Лебядзёўка»);

«Усім радасна ў такі дзень. *Радасна і мне.* Радасна і вунь таму хлапчуку год васьмі, што спускаецца з гары, падскакваючы на адной назе ды махаючы белым дубцом.

*Мы сустракаемся з ім на мосце. Ён прыпыняецца і глядзіць на мяне так, нібы хоча нешта сказаць.* Радасць, шчасце так і пырскаюць з яго блакітных вачэй. *Я разумею яго*» (*Янка Маўр.* «Шчасце»);

«*Гэта кажу Вам я, Мурка,* рудаватая котка з белым колцам на чорна-бурым хвасце. *Мой аповед шчыры і праўдзівы. У ім — мой горкі вопыт,* жаданне ўберагчы Вас ад памылак, паспешлівых крокаў... У ім — цвёрдае перакананне, што бяду цяжка прадбачыць. Аднак нельга і адчайвацца, калі яна ўжо цябе напаткала. І нельга губляць мужнасці, якая так патрэбна кожнаму з нас у складаных жыццёвых абставінах» (*Алесь Савіцкі.* «Прыгоды Муркі»);

### ***Вершаваныя (паэтычныя) творы на ўроку літаратуры***

Успрыманне лірычных твораў эмацыянальна-вобразнае, засноўваецца на абуджэнні ў дзяцей пачуццяў і ўяўленняў. Эмацыянальны кантакт чытача з аўтарскім настроем — зыходная ўмова ўзнікнення эстэтычнага суперажывання. Высокі эмацыянальны накал урока, сіла ўздзеяння на падлеткаў у першую чаргу залежаць ад падбору твораў, аднак не апошнюю ролю ў гэтым працэсе адыгрываюць намаганні і майстэрства настаўніка. Прафесіяналізм, глыбокая асабістая зацікаўленасць у выніках сваёй працы, здольнасць уплываць на

кожнага вучня дапамагаюць настаўніку стварыць на ўроку творчую атмасферу, дзе гарманічна спалучаюцца думка і пачуццё, сур'ёзная праца і духоўная асалода. Каб настаўнік мог максімальна скарыстаць багаты выхаваўчы і навучальны патэнцыял лірыкі ў працэсе далучэння школьнікаў да высокага мастацтва, мэтазгодна найперш спыніцца на родава-жанравых адметнасцях лірычных твораў і асаблівасцях іх успрымання малодшымі падлеткамі (на занятках спачатку ўжываюцца тэрміны «вершаваныя» і «паэтычныя» творы, і толькі калі на ўроках рускай літаратуры вучні атрымаюць першаснае паняцце пра лірыку, можна аперыраваць гэтым тэрмінам).

Лічыцца, што лірычныя творы найбольш складаныя для ўспрымання вучнямі-падлеткамі, бо ні адзін з літаратурных родаў не ўспрымаецца так спецыфічна, як лірыка — найбольш суб'ектыўны від літаратурнай творчасці. Паэтычны слоўнік, вобразнасць, рытміка, мелодыка, спецыфічная будова лірычных твораў ўскладняюць іх успрыманне юнымі чытачамі. Высокая кандэнсацыя думкі, сцісласць, невялікі аб'ём верша, калі праз нямногія гукі, словы, нават паўзы неабходна спасцігнуць глыбокі сэнс, зразумець асацыяцыі і аўтарскія пачуцці, надзвычай абцяжарваюць разуменне лірычных твораў малодшымі падлеткамі. Да таго ж дзеці яшчэ псіхалагічна не падрыхтаваны (з-за невялікага жыццёвага і чытацкага вопыту, узростава-псіхалагічных асаблівасцей) да ўспрымання «дарослых» душэўных перажыванняў, філасофскіх роздумаў, эстэтычных ацэнак з'яў рэчаіснасці, адлюстраваных у лірычных творах. Разам з тым менавіта лірыка займае асобае месца ў выхаванні эстэтычных і маральных пачуццяў, эмацыянальнай успрымальнасці школьнікаў. Яна здольная максімальна актывізаваць эмацыянальную сферу чытачоў, выклікаць моцныя асабістыя эмацыянальныя ўзрушэнні. Раскрываючы багацце і шматграннасць перажыванняў чалавека, яго высокіх душэўных парыванняў, лірычныя творы абвастраюць эмацыянальную ўражлівасць дзяцей, спрыяюць выхаванню мастацкага густу і культуры пачуццяў, фарміруюць духоўную сферу падлеткаў.

Настаўніку варта імкнуцца паказаць на занятках, што толькі лірыцы ўласціва *вобразнае* выяўленне чалавечых пачуццяў, перажыванняў, эмоцый саміх па сабе, у самараскрыцці, без якой-небудзь сюжэтнай матывіроўкі. На канкрэтных прыкладах пяцікласнікі ўбачаць, што паэты не імкнуцца да шырокага сюжэтнага адлюстравання шматграннасці жыцця і поўнай абмалёўкі чалавечых характараў у адным творы, яны звычайна абмяжоўваюцца толькі асобным момантам, што найбольш уразіў іх ўяўленне, і выказваюць з гэтай нагоды свае думкі і пачуцці. Таму для лірыкі характэрна не апісанне жыццёвых падзей, а іх эмацыянальнае перажыванне і асэнсаванне, духоўная рэакцыя, эмацыянальны водгук на з'яву жыцця. Праз шматлікія адценні чалавечых пачуццяў — каханне, захапленне, радасць, удзячнасць, нянавісць,

расчараванне, пагарду, гнеў, страх, крыўду, смутак, тугу, горыч і іншыя эмоцыі паўстае ў лірыцы акаляючы свет у яго разнастайных праявах. Вельмі істотна, каб вучні зразумелі, што менавіта *адлюстраваннем жыцця праз суб'ектыўнае перажыванне* і вызначаецца лірыка.

Адрозненне лірыкі ад эпасу і драмы грунтуецца на характары лірычнай вобразнасці. У літаратуразнаўстве *вобраз* разумеюць як жывую карціну чалавечага жыцця. У эпасе мы бачым вобраз-характар. У аснове лірычнага твора ляжыць вобраз-перажыванне. Асноўным зместам вобраза ў лірыцы становіцца не столькі асоба, прадмет ці з'ява знешняга свету, колькі выкліканае імі пачуццё ці адценне яго, якое перадаецца ў арэоле канкрэтных асацыяцый са знешняга свету. Вобраз-перажыванне адлюстроўвае думкі і пачуцці чалавека ў канкрэтны момант яго жыцця, калі перажыванне цалкам захапіла яго, і ўсе жыццёвыя сувязі адышлі на другі план.

Пяцікласнікі паступова пачнуць разумець, што асоба аўтара ў лірыцы выступае паўней, ярчэй, чым у эпасе і драме. Лірычнае перажыванне з'яўляецца выражэннем уласнага «я» паэта, яго ўнутранага свету. У лірыцы як ні ў якім іншым родзе адлюстроўваюцца маральна-этычнае крэда аўтара, яго жыццёвая філасофія, эстэтычная ацэнка з'яў рэчаіснасці. Аднак кожны паэт — прадстаўнік пэўнага сацыяльнага асяроддзя, канкрэтнай гістарычнай эпохі, і таму лірычнае перажыванне ў кожным творы — гэта мастацкае абагульненне пэўнага грамадскага погляду, абумоўленага канкрэтнымі гістарычнымі абставінамі.

Лірычны твор успрымаецца чытачамі як жывая карціна духоўнага жыцця чалавека, як выяўленне свету яго думак і пачуццяў. Гэта дазваляе зразумець і ацаніць мастацкія вартасці твора, яго эмацыянальную афарбоўку, лексічнае і інтанацыйнае багацце, гукавую інструментоўку і інш. Слова — самы эфектыўны, жывы і рухомы сродак перадачы думак і эмоцый. У вершы слова — сапраўдны чарадзейны знак. Яно і карціна, якая нясе ў сабе аўтарскую эстэтычную ацэнку рэчаіснасці, і сэнсавая, і эмацыянальна-псіхалагічная адзінка. Але ў лірыцы значнае не толькі слова, але і рытм, гук, метр, рыфма, паўза. Само гучанне вершаванай мовы, мелодыка верша ў лірыцы набываюць сэнсавае і мастацкае значэнне. У лірыцы змястоўнасць формы асабліва відавочная.

Лірыка сёння не мае выразнай жанравай класіфікацыі. Часта ў лірычным творы пераплятаюцца розныя жанры, сучасныя і даўнейшыя. Таму ў сённяшняй практыцы лірычныя творы групуюць у залежнасці ад тэматычнай дамінанты. Паколькі жыццё людзей шматграннае, іх духоўныя патрабаванні не аднолькавыя, аднаму паэту ў канкрэтны выпадак жыцця бліжэй аказваецца ўнутраны свет чалавека або ўспрыманне прыроды, а другога больш хвалююць грамадзянскія памкненні — лёс і гісторыя краіны, цэлага народа. Інтымная лірыка дапамагае паглыбіцца ў сябе, грамадзянская — паказвае сацыяльныя і псіхалагічныя сувязі

асобы з грамадствам, рухам гісторыі. Канешне, такі жанравы падзел вельмі ўмоўны. Звычайна ў адным творы пераплятаюцца самыя розныя матывы, і яго эстэтычная вартасць вызначаецца не тэматычнай актуальнасцю, а глыбінёй мастацкага абагульнення, тыповасцю выяўленых пачуццяў, гармоніяй формы і зместу.

Праграмай факультатыва па беларускай літаратуры прадугледжваецца знаёмства пяцікласнікаў з шэрагам лірычных твораў рознай тэматыкі. У першым раздзеле праграмы (*«Роднае слова»*) прапанаваны для разгляду творы патрыятычнага гучання, у чацвёртым (*«Прыроды вечная краса»*) шырока прадстаўлены прыродаапісальныя творы, і сярод іх шмат лірычных вершаў. Яны разнастайныя па настроі, унутраным змесце, вобразнасці: у іх прырода паўстае чароўнай і адухоўленай, рамантызаванай і рэалістычнай. Прырода для паэтаў — крыніца радасці і эстэтычнай асалоды, духоўнай моцы і творчага натхнення. З любоўю і замілаваннем малююць яны беларускія краявіды. Асобы выключныя, таленавітыя, паэтычна адораныя і разам з тым бясконца ўлюбёныя ў прыроду, яны ўмеюць не толькі заўважаць яе прыгажосць і непаўторнасць, але і адмыслова выказаць свае думкі і разважанні, перадаць эмоцыі і пачуцці ў незабыўных паэтычных радках, знайшоўшы для кожнай прыроднай з’явы найбольш трапныя словы і вобразы. Здавалася б, падлеткі, знаёмячыся з пейзажным вершам, павінны без цяжкасці «бачыць» усе гэтыя колеры і фарбы, «чуць» усе гукі прыроды, адчуваць стан душы аўтара, яго хваляванні і перажыванні. Між тым вопыт паказвае, што вывучэнне пейзажнай лірыкі ў сярэдніх класах выклікае пэўныя цяжкасці. Вобразнасць, рытмічнасць, музыкальнасць, своеасаблівы паэтычны сінтаксіс вершаванай мовы (у спалучэнні з недастаткова развітым творчым уяўленнем пяцікласнікаў) ускладняюць разуменне лірычных твораў. Не спрыяюць пазітыўнаму стаўленню дзяцей да прыродаапісальных вершаў адсутнасць у іх сюжэта, выразнага дзеяння, засяроджанасць на раскрыцці душэўнага стану чалавека (які малодшым падлеткам бывае цяжка зразумець — не стае так неабходнага эмацыянальнага і жыццёвага вопыту). Аднак думаецца, што прычыну «няўважлівых» адносін школьнікаў сярэдніх класаў да пейзажнай лірыкі трэба шукаць не столькі ў тым, што дзеці яшчэ «не дараслі» да яе разумення, колькі ў недапрацоўцы настаўнікаў пачатковай школы і няўвазе бацькоў. Гэтыя прабелы мусіць тэрмінова выпраўляць настаўнік-славеснік, арганізоўваючы на занятках вывучэнне прыродаапісальных твораў з улікам іх мастацкай спецыфікі, узроставых і псіхалагічных асаблівасцей малодшых падлеткаў. Неабходна імкнуцца, каб кожная сустрэча вучняў з паэтычным шэдэўрам была сапраўдным святам. У гэтай справе важнае усё: найперш сам твор, майстэрства і эрудыцыя настаўніка, яго асабістае стаўленне да паэзіі, эмацыянальная настроенасць і зацікаўленасць вучняў.

Існуюць розныя формы падрыхтоўкі вучняў да ўспрымання пейзажнай лірыкі. Гэта могуць быць эмацыянальнае ўступнае слова настаўніка, гутарка з вучнямі на загадзя акрэсленую тэму, экскурсія на прыроду, выкарыстанне твораў музыкі і жывапісу, вусныя творчыя замалёўкі школьнікаў і папярэдне падрыхтаваныя імі пейзажныя малюнкі ці фотаздымкі і г. д. Нарэшце, магчымае спалучэнне розных відаў працы. Поспех залежыць ад ініцыятывы і творчага падыходу настаўніка, разнастайнасці і змястоўнасці ўрока. Важна, каб гэты этап заняткаў быў цікавы, эмацыянальны і непрацяглы па часе.

Надзвычай эфектыўным і разам з тым нескладаным пры падрыхтоўцы вучнёўскага ўспрымання з'яўляецца ўступнае слова настаўніка (аповед пра асобны цікавы выпадак з жыцця паэта, творчую гісторыю верша і інш.). Добры плён даюць таксама экскурсіі на прыроду, хоць вымагаюць шмат часу і сур'ёзнай падрыхтоўкі, аднак на факультатыўных занятках іх ажыццявіць значна лягчэй, чым на ўроку. Адзіная ўмова — каб такая экскурсія была эмацыянальна сугучная твору, які будзе разглядацца. Даследаванні псіхолагаў і педагогаў сведчаць, што жыццё прыроды адкрываецца дзецям значна раней, чым складаны свет чалавечых адносін, што слыхавыя і зрокавыя ўражанні ўздзейнічаюць на іх мацней, чым вобразна-сэнсавыя, і што сваёй разнастайнасцю прырода цалкам задавальняе патрэбы малодшых падлеткаў у змене ўражанняў. І калі гэта так, то назіранні за прыродай могуць стаць для пяцікласнікаў першай прыступкай на шляху ў чароўны свет прыгожага, свет мастацтва, і задача настаўніка — навучыць дзяцей бачыць і разумець прыроду ў жыцці і мастацтве. Падчас экскурсіі ён дапаможа сваім выхаванцам заўважыць у прыродзе характэрнае і адметнае, непаўторнае, убачыць тыя дэталі, моманты і прыродныя з'явы, на якія вучні самі маглі б і не звярнуць увагі. Варта прапанаваць пяцікласнікам дакладна, ярка і прыгожа апісаць словамі карціны, якія яны бачаць. Працэс назірання за прыродай павінен быць актыўным, запоўненым індывідуальнымі і калектыўнымі пошукамі найбольш выразных і дакладных слоў, каб перадаць убачанае і выказаць свае эмоцыі. Магчыма, не адразу вучні знойдуць трапныя выразы, але такія спробы ім пойдуць на карысць. Сумесная праца дапаможа дзецям пераканацца, як важна і разам з тым цікава і прыемна знайсці патрэбнае слова. Кожная такая знаходка — гэта маленькае адкрыццё. Пошук дакладнага і выразнага слова будзе паступова набліжаць вучняў да стварэння мастацкага вобраза.

Працэсы спасціжэння прыроды і мастацтва ўзаемазвязаныя. Не толькі назіранне за прыроднымі з'явамі дапамагае глыбей успрыняць мастацкі твор, але і, наадварот, дасканаласць паэтычных радкоў абвастрае ўвагу дзяцей да прыроды, вучыць іх заўважаць багацце колераў, фарбаў, гукаў, пашырае ўяўленні аб навакольным свеце, дапа-

магае зразумець і ў пэўнай ступені нават перажыць асобныя пачуцці, што зведаў паэт.

Самае галоўнае на занятках — мастацкі твор. Хвіліны непасрэднага знаёмства з ім найбольш уздзейнічаюць на эмацыянальную сферу вучняў, і ад выразнасці настаўніцкага чытання ў значнай ступені залежыць вучнёўскае ўспрыманне. Пажадана, каб пры кожнай сустрэчы з пейзажным творам у вучняў узнікала пачуццё, якое яшчэ Арыстоцель назваў «радасцю пазнавання», каб у іх абуджаліся асацыяцыі з некалі ўбачанай карцінай прыроды, каб дзеці адчувалі нешта знаёмае і блізкае іх сэрцу, а паэтычныя радкі адгукаліся ў іх душы перажытым уражаннем. Тады ствараецца той цесны кантакт паміж паэтам і вучнем, без якога цяжка актыўна ўспрыняць твор.

Першаснае ўспрыманне — аснова для аналізу. Аналізуючы верш, падлеткі вучацца ўзнаўляць у сваім уяўленні карціны, створаныя паэтам, больш чула і ўважліва ставіцца да слова, спасцігаць мастацкія вобразы, асэнсоўваць аўтарскія пачуцці. Пры гэтым развіваецца мысленне, адточваюцца думкі, фарміруецца ўласная пазіцыя школьнікаў.

Напрыклад, падчас разгляду верша Пімена Панчанкі «Красавіцкая навальніца» асноўную ўвагу пяцікласнікаў мэтазгодна звярнуць на мастацкія вартасці тэксту, творчыя знаходкі паэта. З вялікай эмацыянальнай сілай аўтар паказвае радаснае чаканне вясны. У вершы — вітанне жыцця, імклівасць руху, поўная гармонія прыроды і чалавека. Уся яго сіла ў вобразнасці, эмацыянальнасці, гарманічнасці. Настаўнік засяродзіць увагу дзяцей на дзвюх кантрасных карцінах — апісанні красавіцкай навальніцы як свята і радасці прыроды і абуджэнні зямлі, абмытай першым веснавым дажджом. Гэтыя карціны адрозніваюцца гучаннем, афарбоўкай, эмацыянальным настроем. Для больш выразнага апісання першай навальніцы паэт шырока ўжывае вобразныя мастацкія сродкі. Каб паказаць веліч і магутнасць хмар, паэт супастаўляе іх з айсбергамі: *І тады прыйшлі паважна хмары — // Айсбергі падсонечных вышынь.* Гучанне струменяў дажджу параўноўваецца са звонам струн: *А струмені звоняць, нібы струны.* У вершы шмат увасабленняў: *Гром у бубны гулкія ударыў, // Цішыню густую пакрышыў; І злуюцца ў хмарах бліскавіцы; Сушаць вербы пасмы жоўтых кос; Сонца промні зыркія варушыць, // Ніткі залацістыя прадзе; А Зямля абмытая дыміцца, // Дыхаючы поўнымі грудзьмі.*

Імкнучыся перадаць рух, хуткасць падзей, зменлівасць карцін, аўтар ужывае эмацыянальна афарбаваныя дзеясловы і дзеяслоўныя формы: *ударыў, пакрышыў, б’е, злуецца, забушуюць, абсыпаючы.* Паэт імкнецца выклікаць яркія слыхавыя ўяўленні першага грому, уражанне сілы і моцы якога дасягаецца не толькі маляўнічасцю паэтычнага слова, але і гукавой інструментоўкай верша. Пры дапамозе алітэрацый і асанансаў перадаецца навальнічная атмасфера:

***Гром** у бубны гулкія ударыў, **цішыню** густую **пакрышыў**.* І далей перад намі ўжо іншая карціна: веснавая навальніца як хутка надышла, так і адышла, і зямля, радасная і шчаслівая, прачынаецца ад доўгага зімовага сну. У песенна-вясёлым і бадзёрым рытме верша чуецца і птушыны спеў у лесе, і дыханне абагрэтай сонцам і абласканай веснавым ліўнем зямлі. Радасная сустрэча вясны абуджанай прыродай, цеплыня аўтарскага пачуцця і своеасаблівая пяшчота выяўляюцца ў мілагучнасці і напеўнасці верша, у трапных эпітэтах: *елкі цёмнагрывыя, зямля абмытая, густыя руні, срабрыстыя ягады-росы, пасмы жоўтых кос, зыркія промні.* Аптымістычнае жыццесцвярджэнне, адчуванне свята вясны, абуджэнне прыроды, спадзяванне на добры ўраджай выклікаюць бадзёры і радасны настрой. Паэт з захапленнем вітае навальніцу, бо з ёй звязаны ўсе лепшыя спадзяванні. І пра яго пачуцці сведчыць не толькі адкрытае прызнанне (*Я люблю часіну навальніцы*), але і суладдзе паэтычных вобразаў, будова верша, яго рытміка, гукавая інструментоўка.

Галоўная мэта работы над выяўленчымі сродкамі мовы не ў тым, каб вучні маглі знайсці іх у тэксце, а каб разумелі іх месца ў вершы, іх ролю ў стварэнні вобраза, навучыліся цаніць не толькі сэнс сказанага, але і трапнасць, дасканаласць мовы, яркасць і арыгінальнасць вобразаў.

Аналіз вобразнага ладу верша, яго настраёвасці, будовы, гукавой інструментоўкі, інтанацыйнай выразнасці паслужыць штуршком для ўласнай творчасці пяцікласнікаў, тым больш, што іх успрыманне верша грунтавалася не толькі на створаных паэтам карцінах прыроды, але таксама і на ўласным жыццёвым вопыце — пяцікласнікам самім не раз даводзілася назіраць за першым веснавым дажджом, і гэтыя выразныя малюнкі не маглі не прыйсці на ўспамін пры чытанні верша. Таму дарэчы будзе прапанаваць вучням прыгадаць тыя свае бачанні, уражанні і пачуцці і пастарацца як мага дакладней расказаць пра іх у сваёй вуснай замалёўцы (ці сачыненні з элементамі апісання) «Прыгажосць навальніца».

Праграмай прапануецца для разгляду на занятках верш Еўдакіі Лось «Мінулагодні ліст». Аналіз яго можна наладзіць прыкладна па такіх пытаннях:

• Якім уяўляецца паэтэсе мінулагодні ліст?

• Якімі сродкамі мастацкай выразнасці карыстаецца аўтар пры стварэнні гэтай пейзажнай замалёўкі?

• Знайдзіце ў тэксце выразныя доказы таго, што аўтар з вялікай пяшчотай, замілаваннем, любоўю ставіцца да сваёй зямлі.

• Як вы разумееце выраз: *І льюцца кроплі, быццам слёзы, // Па твары зморшчаным ліста?*

Цалкам дарэчным будзе заданне параўнаць вершы Пімена Панчанкі і Еўдакіі Лось, блізкія па тэме, тым больш, што пяцікласнікі ўжо маюць падобны вопыт, і падрыхтаваць вусную замалёўку пра першы

веснавы дождж. Заданне можна ўскладніць, прапанаваўшы для супастаўлення празаічны пейзажны ўрывак «Чым пахне дождж» (з рамана Янкі Сіпакова «Даверлівая зямля»). Такое заданне будзе пасільным не для ўсіх вучняў, таму мэтазгодна калектывам папрацаваць над ім і падрыхтаваць супольную замалёўку.

Увогуле, такі від работы, як супастаўленне двух твораў розных жанраў, блізкіх па тэматыцы, добра зарэкамендаваў сябе не толькі пры вывучэнні пейзажных твораў. Можна будзе на занятках прапанаваць пяцікласнікам параўнаць, напрыклад, радкі верша Ніла Гілевіча «Сцежкі да родных магіл» і апавяданне Янкі Брыля «Маці». Мэта супастаўлення ў тым, каб вучні змаглі адрозніць спосаб *абмалёўкі* характару ад спосабу яго *выяўлення* ў мастацкім творы. Вучні без цяжкасці зазначаць, што абодва творы напісаны прыкладна ў адзін час: апавяданне ў 1957 годзе, двума гадамі пазней — верш. Творы прысвечаны адной тэме — услаўленню гераічнага подзвігу беларускай жанчыны ў час Вялікай Айчыннай вайны, неўміручасці яго ў сэрцах удзячных нашчадкаў. Затым пяцікласнікі паспрабуюць высветліць, чым творы розняцца. Перш за ўсё яны звернуць увагу на знешнія прыкметы: аб'ём (верш займае адну старонку, апавяданне — чатыры), форму, асаблівасці мовы (у вершы яна рытмічная, рыфмаваная, у апавяданні — звычайная, празаічная).

З дапамогай настаўніка вучні паспрабуюць высветліць, што паслужыла непасрэдным штуршком для напісання твора. Янка Брыль ішоў ад страшнай праўды жыцця. У сваёй кнізе «Трохі пра вечнае» ён успамінае, што яго маці ў час вайны хавала параненага Ціхана, ведаючы, як жорстка караюць фашысты за такое. Не давала пісьменніку спакою і незабыўнае відовішча, як увосень сорак першага года ў Стоўбцах немцы гналі расстрэльваць старую босую сялянку і чатырох чырвонаармейцаў. Праз нейкі час з могілак пачуліся аўтаматныя чэргі, а потым, пасвістваючы, фашысты вярталіся адны. Гэты выпадак доўга хваляваў пісьменніка, і ён распавёў пра сціплую жанчыну-маці, якая, ахвяруючы сваім жыццём, дала прытулак чырвонаармейцам.

Настаўнік асцярожна наблізіць дзяцей да вываду, што, рэалістычна абмалёўваючы кожны эпізод, адцяняючы знешні выгляд маці, пэўныя рысачкі яе твару, пісьменнік праз канкрэтныя замалёўкі, асобныя карціны апавядання дазваляе чытачам даведацца пра доўгае і цяжкое жыццё жанчыны, пра тое жудаснае лета на пачатку вайны, пра спаленыя сялянскія хаты і сялібы, пра адзіную ўцеху маці ў гэтым страшным усенародным выпрабаванні — яе сыноў, двое з якіх — у Чырвонай Арміі, а малодшы, Васілёк, пакуль што з ёй, але ж, напэўна, і ён задумаў нешта небяспечнае, і праз гэта маці кожную ноч не спіць. Зразумелымі становяцца і вытокі яе подзвігу, і тое, што не магла яна паступіць інакш, убачыўшы знясіленых байцоў. Вучні прыйдуць да высновы, што праз падрабязнае апісанне апошняга пакутніцкага шляху назаў-

сёды з'ядналых горкім лёсам чацвярых змардаваных чужых сыноў і беларускай жанчыны-маці ад роднае хаты да свежай ямы на могілках Янка Брыль услаўляе подзвіг простай сялянкі, непрыкметнай з першага погляду і такой велічнай у сваёй шчырасці, самаахвярнасці і мужнасці, подзвіг, незабыўны для нашчадкаў.

Прааналізаваўшы верш «Сцежкі да родных магіл», вучні заўважаць, што паэт, выказваючы ў творы боль і смутак ад заўчаснай смерці дзяўчыны-чырвонаармейца Валянціны Малышка, заклікае свята ўшаноўваць памяць тых, хто ахвяраваў сваім жыццём і загінуў. Вучні, абапіраючыся на змест твора, скажуць, што верш створаны пад уражаннем убачанай пры дарозе сціплай магілкі з хвойкамі вакол абеліска. Надпіс на ім паведаміў, што летам 1944 года ў барацьбе з фашыстамі загінула дваццацігадовая дзяўчына. Гэта вельмі ўразіла паэта, і ён не змог не падзяліцца сваімі пачуццямі. Ні паэту, ні чытачам невядомы абставіны, пры якіх загінула дзяўчына, яе знешні выгляд, яе мары і спадзяванні:

*Не знаю, чарнявай ці русай была,*
*Ці стрыжку насіла, ці косы...*
*Яна за Радзіму жыццё аддала.*
*Хіба гэта ведаць — не досыць?*
*Для нас, маладых, засталіся ў лугах*
*Яе не сабраныя краскі,*
*І белай чаромхі дурманлівы пах,*
*І сонца гарачыя ласкі.*

Сваю ўсхваляванасць, узрушанасць паэт перадае праз задуменную інтанацыю, запаволены рытм, просты сінтаксіс, мастацкія вобразы сіратлівых лугавых кветак, якімі не паспела нацешыцца дзяўчына пры жыцці, не зведала, напэўна, і першага дзявочага кахання (нездарма згадвае паэт сімвал дзявочай чысціні і прыгажосці — белую чаромху).

Такім чынам, на факультатыўных занятках настаўнік мае час і магчымасці разнастаіць формы і віды працы, разглядаць мастацкія тэксты з розных ракурсаў. Нельга забывацца і на тое, што кожны твор патрабуе асобага падыходу. Якой бы цікавай або карыснай ні была метадычная знаходка, яна згубіць сваю каштоўнасць, калі будзе выкарыстоўвацца аднастайна, па шаблону, або вельмі часта. Настаўнік вымушаны ажыўляць формы аналізу, шукаць новыя прыёмы работы, якія будуць гнуткімі, змяняцца і паступова ўскладняцца, адпавядаць духу твора, патрэбам і магчымасцям вучнёўскага калектыву, канкрэтным вучэбным мэтам. Звычайна метадычная творчасць настаўніка праграмуе творчыя адносіны вучняў, атмасферу пошуку на занятках, узмацняе ўздзеянне літаратуры на асобу дзіцяці. Шукаць і адкрываць новае ў мастацкім тэксце пакліканы не толькі вучань, але і настаўнік.

# ЛІТАРАТУРА


Артоболевский, Г. Б. Художественное чтение / Г. Б. Артоболевский. — М., 1978.

Буяльский, Б. А. Искусство выразительного чтения : книга для учителя / Б. А. Буяльский. — М., 1986.

Выкладанне беларускай мовы і літаратуры / пад рэд. М. А. Лазарука. — Мн., 1983.

Завадская, Т. Ф. Искусство чтения в художественном развитии подростка / Т. Ф. Завадская. — М., 1968.

Калеснік, У. Вусная мова і выразнае чытанне / У. Калеснік, Ф. Янкоўскі. — Мінск, 1962.

Каляда, А. А. Мастацкае чытанне ў школе / А. А. Каляда. — Мінск, 1992.

Ладыженская, Т. А. Живое слово / Т. А. Ладыженская. — М., 1986.

Лазарук, М. А. Навучанне і выхаванне творчасцю / М. А. Лазарук. — Мінск, 1994.

Лаўрэль, Я. М. Навучанне сціСламу пераказу / Я. М. Лаўрэль // Народная асвета. — 1985. — № 2. — С. 34—39.

Лаўрэль, Я. М. Выбарачны пераказ і методыка яго правядзення / Я. М. Лаўрэль // Народная асвета. — 1986. — № 5. — С. 37—42.

Лаўрэль, Я. М. Пераказ з творчымі заданнямі / Я. М. Лаўрэль // Народная асвета. — 1986. — № 8. — С. 43—48.

Ленсу, А. Я. Вывучэнне тэорыі літаратуры ў школе / А. Я. Ленсу. — Минск, 1985.

Ляшук, В. Я. Вывучэнне эпічных твораў / В. Я. Ляшук. — Мінск, 1987.

Методика выразительного чтения // под ред. Т. Ф. Завадской. — М., 1977.

Методыка выкладання беларускай літаратуры / пад рэд. В. Я. Ляшук. — Мн., 2002.

Никольская, С. Т. Техника речи / С. Т. Никольская. — М., 1978.

Протчанка, В. У. Роднае слова — крыніца развіцця асобы, духоўнасці асобы / В. У. Протчанка // Адукацыя і выхаванне. — 1994. — № 12.

Рагойша, В. П. Гутаркі пра верш: Метрыка, рытміка, фоніка / В. П. Рагойша. — Мінск, 1979.

Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / / В. П. Рагойша. — Мінск, 1979.

Роднае слова захапляе, узбагачае, выхоўвае / скл. М. Б. Яфімава. — Мінск, 1991.

Смыкоўская, В. І. Развіццё мовы вучняў на ўроках літаратуры / В. І. Смыкоўская. — Мінск, 1988.

Туркевіч, В. М. Творчасці зярняты залатыя / В. М. Туркевіч. — Мінск, 1985.

Урок літаратуры ў школе : кніга для настаўніка / пад рэд. М. А. Лазарука, В. У. Івашына. — Мінск, 1995.

Цітова, Л. К. Асаблівасці ўспрымання лірыкі вучнямі V—VIII класаў / Л. К. Цітова. — Мінск, 1993.

Яленскі, М. Г. Развіццё вуснай мовы вучняў / М. Г. Яленскі. — Мінск, 1985.

Янкоўскі, Ф. М. Беларускае літаратурнае вымаўленне / Ф. М. Янкоўскі. — Мінск, 1970.

Янкоўскі, Ф. М. Само слова гаворыць / Ф. М. Янкоўскі. — Мінск, 1986.

Яфімава, М. Б. Гучыць жывое слова / М. Б. Яфімава. — Мінск, 1983.

# ЗМЕСТ

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў** . . . . . . . . . . . . . . 3

**Тлумачальная запіска** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**«Браму скарбаў сваіх адчыняю...»** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
I. Роднае слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
II. Вусная народня творчасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
III. Казка — у жыцці падказка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
IV. Прыроды вечная краса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
V. Жыццёвымі сцежкамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
VI. Прыгоды . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Конкурс на лепшага чытальніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

**Дапаможнік для настаўнікаў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13

**Уводзіны** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13

**Прыкладнае тэматычнае планаванне**
**факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры** . . . . 15

**Метадычныя парады** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
I. Роднае слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
II. Вывучэнне фальклорных твораў . . . . . . . . . . . . . . . . 31
III. Вывучэнне мастацкіх твораў з улікам іх
родава-жанравай спецыфікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

**Літаратура** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61

Вучэбнае выданне

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**ЦІТОВА** Людміла Канстанцінаўна

**«БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЮ…»**

**5 клас**

***Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

Рэдактар *М. Н. Мінзер*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Макаранка*
Мастацкі рэдактар *В. П. Калінін*
Стыльрэдактар *Н. Ф. Крыцкая*

Падпісана ў друк 7.09.2010. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Times New Roman. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 3,72. Ул.-выд. арк. 4,05. Тыраж 3400 экз. Заказ .

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва».
ЛИ 02330/0494044 ад 03.02.2009.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Друкарня "Перамога"».
ЛП 02330/0494182 ад 03.04.2009.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна, Рэспубліка Беларусь.